

# «МЫ АБАВЯЗАНЫ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ І РУХАЦЦА РАЗАМ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СВОЙ ТЭХНАЛАГІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ»

**Падрабязнасці перагавораў Прэзідэнта з губернатарам Астраханскай вобласці** (Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 МАЯ 2025 г. СУБОТА № 85 (30473)

# ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

**Пачалася нарыхтоўка травяністых кармоў**



Фота БелТА.

На сёння ў краіне практычна пасеяны ўсе яравыя збожжавыя і зернебабовыя (больш за 99 %). «У Віцебскай вобласці засталося іх дасеяць літаральна на некалькі дзён, — адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства — начальнік упраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Іван КАСКЕВІЧ**. — Кукурузу, грэчку і проса будзем сеяць па меры нашых магчымасцяў. Амаль скончылі сяўбу лёну-даўгунцу і цукровых буракоў. Гэтага салодкага прадукту засталося менш за 2 % ад запланаваных плошчаў. Яравы рапс засеяны на 93 % плошчаў, кукуруза — на 39 %, у тым ліку кукуруза на зерне — 73 %. Акрамя таго, ужо пасаджана больш за палову плошчаў бульбы, запланаваных на гэты год».

Пасяўныя работы ідуць у палях арганізавана, строга па графіку, адзначыў Іван Каскевіч. «Галоўнае, каб надвор'е не падвяло», — заўважыў спецыяліст Мінсельгасхарча. Як вядома, у некалькіх рэгіёнах краіны назіраліся досыць сур'ёзныя замаразкі.

«Днямі мы накіравалі групу навукоўцаў для агляду тых раёнаў Палесся, якія былі максімальна ахоплены замаразкамі, — паведаміў Іван Каскевіч. — Па выніках абследаванняў будуць выпрацаваны рэкамендацыі, якімі аграрыі і скарыстаюцца. Тады будзе відаць, што з пашкоджанымі пасевамі рабіць. Калі ўзяць той жа рапс, па якім мароз прайшоўся выключна па верхавінах, а ніжняя частка жывая і здаровая, то адрастанне цалкам магчыма. Далей з гэтай культурай трэба працаваць больш беражліва, напрыклад, дадаць азот або іншую падкормку. Такім чынам, будзе праведзена нівеляванне пашкоджанняў, якія ўзніклі ў выніку мінулых замаразкаў».

Тым часам актыўна разгортваецца нарыхтоўка травяністых кармоў. У прыватнасці, у Гродзенскай вобласці ўжо пачаліся адпаведныя работы. Першы ўкос тут пачаўся ў аптымальныя тэрміны, што дазволіць нарыхтоўваць высакаякасныя па пажыўных характарыстыках кармы. А ў Мінскай вобласці першы ўкос пачнецца на наступным тыдні. «Завяршаем рамонт тэхнікі, хаця асноўная сіла, а гэта кормаўборачныя камбайны, ужо гатова, — адзначыў БелТА **старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама Сяргей ПРЫМАЧЭНКА**. — Усяго падчас першага ўкосу будзе задзейнічана больш як 1,5 тысячы адзінак рознай тэхнікі».

АКАДЭМІЧНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ — БЯСПЕЧНАЯ І ЯКАСНАЯ АДУКАЦЫЯ 13



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!




## ЗОРКА ПОДЗВІГУ АЛЯКСЕЯ РАКІЦЯНСКАГА




**Калекцыя ўзнагарод Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны папоўнілася чарговым медалём «Залатая Зорка»**

З 1957 да 2020 года ў музейны фонд паступілі 25 вышэйшых узнагарод. Уладальнік дваццаць шостага медаля Героя Савецкага Саюза — Аляксей Анісімавіч Ракіцянскі. Гэтага высокага звання гвардыі лейтэнант быў удастоены ў сакавіку 1945 года за подзвіг, здзейснены падчас правядзення Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён». Маладому чалавеку было 23 гады.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X

# «МЫ АБАВЯЗАНЫ СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ І РУХАЦЦА РАЗАМ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СВОЙ ТЭХНАЛАГІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ»

**Падрабязнасці перагавораў Прэзідэнта з губернатарам Астраханскай вобласці**

Гэта ўжо пяты прыезд Ігара Бабушкіна ў Беларусь, што сведчыць аб эфектыўнасці і паглыбленні двухбаковага супрацоўніцтва. Звяртаючыся да кіраўніка паўднёвага расійскага рэгіёна, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Ігар Бабушкін — даўні, жаданы госць Беларусі, які добра ведае нашу краіну. «І калі губернатар Расіі чарговы раз прыязджае да нас, я гэта вельмі цаню: значыць, у яго ёсць тут пытанні і, значыць, мы па пэўных кірунках можам больш глыбока супрацоўнічаць, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — Таму я вельмі рады, што вы са сваімі калегамі прыехалі ў Беларусь. Мы зробім усё для таго, каб тыя пажаданні, якія вы выкажаце, былі рэалізаваны».



## «ПА ЯКАСЦІ І ЦАНЕ КАНКУРЭНТАЎ У АСТРАХАНСКАЙ ВОБЛАСЦІ НАМ НЯМА»

Аляксандр Лукашэнка агучыў асноўныя кірункі супрацоўніцтва з Астраханскай вобласцю, у тым ліку разлічаныя на перспектыву. Найперш гэта пастаўка сельскагаспадарчай тэхнікі. 70 % трактарнай тэхнікі ў гэтым расійскім рэгіёне — вытворчасці Мінскага трактарнага завода.

«Натуральна, трактарам не ўзарэш і не пасееш: патрэбны прычапныя прылады, — заўважыў Прэзідэнт.

**— Павінен вам сказаць, што па якасці і цане канкурэнтаў у Астраханскай вобласці нам няма. Таму, калі патрэбна будзе ў гэтым плане супрацоўніцтва (хаця лішняга нічога няма: усе з задавальненнем купляюць, асабліва афрыканскія дзяржавы), мы заўсёды для Расіі вырабім хоць у трэцюю, хоць у пятую змену. Для вас заўсёды вырабім неабходнае прычапное абсталяванне для трактара, для сельгастэхнікі».**

Такі ж прынцып, па словах кіраўніка дзяржавы, працуе і ў дачыненні да паставак прадуктаў харчавання з Беларусі. «Вашы спецыялісты выказваліся наконт дзіцячага харчавання, іншых прадуктаў харчавання, — гэта не абмяркоўваецца, — адзначыў Прэзідэнт. — Што вам патрэбна, тое мы будзем імкнуцца для вас зрабіць».

Астраханская вобласць выказала зацікаўленасць і ў супрацоўніцтве з адным з найбуйнейшых вытворцаў малочнай прадукцыі ў Беларусі — прадпрыемствам «Бабушкіна крынка». Размова ідзе аб будаўніцтве малакаперапрацоўчага завода ў гэтым расійскім рэгіёне.

«Калі ў вас ёсць цікавасць паранейшаму да гэтага, скажыце, які інвестар з вашага боку будзе, мы гатовы працаваць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І «Бабушкіна крынка» пацвярджае гэта імкненне».

Беларускі лідар звярнуў увагу на адмоўнае сальда з Астраханскай вобласцю. «Будзем імкнуцца да таго, каб выраўняць гэта сальда», — адзначыў Прэзідэнт.

**Але ён заўважыў, што па амерыканскім шляху ні Беларусь, ні Расія не пойдуць, маючы на ўвазе нядаўнія рашэнні Прэзідэнта ЗША па істотным павелічэнні пошлін для шэрагу краін. «Дзякуй Богу, што Дональд зразумеў: у эканоміцы справы так не робяцца, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы гэта цудоўна разумеем, таму гатовы супрацоўнічаць, каб павялічыць паток нашых тавараў у вашу вобласць, каб збалансаваць гандлёвае сальда».**

## «БУДЗЕМ РАЗАМ ПРАЦАВАЦЬ, КАБ ВЫРАШЫЦЬ ТУЮ ЦІ ІНШУЮ ПРАБЛЕМУ»

Кажучы аб пастаўцы ў Астраханскую вобласць пасажырскай тэхнікі, кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што і ў Расіі, і ў Беларусі ад гэтага віду транспарту не адмовяцца. «Нават краіны далёкага замежжа стаўку робяць не на нейкі асабісты транспарт, а на аўтобусы, пасажырскі транспарт, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Аўтобусы, тралейбусы, трамваі і іншае — мы гэта ўсё вырабляем. Вельмі высокай якасці і знешне прыстойнае. Калі ў вас будзе жаданне, вашых спецыялістаў, вы паглядзіце гатовыя вырабы».

**Кіраўнік дзяржавы дадаў, што шэраг асноўных узораў пасажырскай тэхнікі экспануецца на пляцоўцы Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра, які днямі рыхтуецца да адкрыцця. «Калі вас нешта зацікавіць, пальцам пакажыце — будзем разам працаваць, каб вырашыць тую ці іншую праблему», — сказаў беларускі лідар.**

Кажучы аб пастаўках ліфтавага абсталявання, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што пастаўкі беларускіх ліфтаў у Астраханскую вобласць павялічыліся. «Цяпер ідзе перааснашчэнне ліфтавым абсталяваннем ва ўсіх постсавецкіх дзяржавах, — удакладніў Прэзідэнт. — Яно тады было ў асноўным з Расіі і Беларусі. І мы захавалі гэты завод. Можам для вас зрабіць ад ліфтаў да эскалатараў — усё, што вам спадабаецца. Можаце быць упэўнены, што ў гэтым плане будзем па-ранейшаму вам цікавымі, зробім усё для таго, каб гэта абсталяванне вам паступала».

**Падчас перагавораў абмяркоўвалася і супрацоўніцтва ў сферы меліярацыі. «У вас вельмі вялікі вопыт у гэтым плане, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Мы таксама краіна, можна сказаць, меліяратараў. Вельмі сур'ёзна цяпер працуем. Калі неабходнасць будзе, вы скажыце — дамовімся. І будзем імкнуцца і ў вас працаваць, і ваш вопыт прыцягваць у Беларусь».**

Асобна Прэзідэнт закрануў тэму транспарціроўкі беларускіх грузаў праз астраханскі порт. «У нас ёсць інтарэс, мы працуем з вамі ў гэтым плане, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Ёсць вялікі інтарэс. Калі вы нам акажаце падтрымку, будзе ваша згода, мы з задавальненнем будзем працаваць праз астраханскія парты».

Рэзюмуючы, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Усё, што мы можам зрабіць для вашай вобласці, а значыць, для Расіі, мы зробім. Я абяцаў гэта Прэзідэнту Пуціну, у тым ліку на перагаворах у Валгаградскай вобласці. Па многіх прычынах мы абавязаны і павінны супрацоўнічаць і рухацца разам, каб забяспечыць свой тэхналагічны суверэнітэт, каб людзі разумелі, што мы можам самі, мы можам сваё. Мы аб гэтым дамовіліся з Прэзідэнтам. У гэтым плане мы гатовы перш за ўсё працаваць разам з Расійскай Федэрацыяй».

## «МЫ ГАТОВЫ АБ'ЁМ ПЕРАВАЛКІ ГРУЗАЎ ЗНАЧНА НАРАСЦІЦЬ»

У сваю чаргу губернатар Астраханскай вобласці Ігар Бабушкін нагадаў, што іх папярэдняя сустрэча з беларускім лідарам, якая адбылася ў снежні 2021 года, надала дадатковы стымул развіццю сувязей паміж Астраханскай вобласцю і нашай краінай. «Мы падпісалі пагадненне, сфарміравалі дарожную карту па шматлікіх кірунках, — канкрэтызаваў ён. — Вы іх цяпер практычна ўсе агучылі».

Ігар Бабушкін падкрэсліў, што ў аснове двухбаковых узаемаадносін ляжыць узаемны тавараабарот. «Мы пастаўляем у Беларусь пладова-агародніннную прадукцыю, вялікі аб'ём рыбнай прадукцыі, — канкрэтызаваў губернатар. — З Беларусі да нас ідзе гатовая прадукцыя харчавання, лёгкай прамысловасці, мэбля».

Кіраўнік рэгіёна пацвердзіў наладжанасць працэсу транзіту беларускіх грузаў праз парты Астраханскай вобласці.

**«Сёння нашы парты валодаюць патэнцыяльнай магчымасцю перавалкі грузаў у аб'ёме 16 мільёнаў тон, — звярнуў увагу ён. — Нашы партавікі мадэрнізавалі свае магутнасці пад умовы транзіту грузаў з Рэспублікі Беларусь у краіны Паўднёва-Усходняй Азіі і Персідскага заліва. Грузы ідуць. Гэта лес, папера, тэхніка, угнаенні. Мы гатовы аб'ём перавалкі грузаў значна нарасціць. Умовы для гэтага вельмі зразумелыя, і мы іх абмяркоўваем у рамках работы нашай сумеснай рабочай групы».**

## «У ГЭТЫМ ПЛАНЕ МЫ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ»

У пачатку сустрэчы з губернатарам Астраханскай вобласці, падчас якой прысутнічаў і пасол Расіі Барыс Грызлоў, Аляксандр Лукашэнка канчаткова расставіў кропкі над «і» ў пытанні нашэння і выкарыстання ў Беларусі сімволікі георгіеўскай стужкі. Да гэтай тэмы Прэзідэнт звяртаўся і на перагаворах з Уладзімірам Пуціным у Валгаградзе. Такая ўвага звязана са спробамі ў пэўных колах штучна раскруціць гэта пытанне, зрабіць прадметам разладу ў беларуска-расійскіх адносінах. Разумеючы тэндэнцыю, Аляксандр Лукашэнка прама і адкрыта адрэагаваў, каб спыніць магчымыя інсінуацыі.

Прэзідэнт нагадаў, што сказаў свайму расійскаму калегу: «Хочаце са стужкамі — калі ласка, хочаце з нашымі стужкамі (беларускімі. — **«Зв.»**) — калі ласка. Хто як хоча. Мы ж свае людзі. Мы ж не носім свастыку, як ва Украіне. Вы прапанавалі нам. У гэтым плане мы вызначыліся. Думаю, свая павінна быць нейкая адметнасць».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Беларусі праводзяць акцыю «Беларусь памятае», якая падобна на расійскі «Бяссмяротны полк». «Тое ж самае фактычна, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — І партрэты нясуць. Хто нясе, хто не нясе — справа кожнага. Мы тады моладзі прапанову ўзялі (гэта было маё рашэнне) — моладзь прапанавала, камсамольцы нашы. Вось яны прапанавалі гэты варыянт. Тым больш, моладзь — будучыня. Добры варыянт. Не ўкраінскі. Я кажу: «Добра, няма пытанняў. Хтосьці хоча прайсці з георгіеўскімі... Але не трэба супрацьпастаўляць адзін аднаму. Разам давайце».

«Разам і ходзім», — адрэагаваў пасол Расіі ў Беларусі Барыс Грызлоў.

«Так, гэта і будзе правільна, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — А людзі няхай вызначаюцца».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**



## У тэму

У размове з журналістамі **губернатар Астраханскай вобласці Ігар БАБУШКІН** дадаў, што з Прэзідэнтам Беларусі былі яшчэ раз звераны пазіцыі па арганізацыі ўзаемнага супрацоўніцтва. «Мы арганізавалі работу па лініі аграпрамысловага комплексу: 70 % тэхнікі нашымі сельгасвытворцамі закупляецца ў Мінскага трактарнага завода, — канкрэтызаваў ён. — Тры гады таму на тэрыторыі Астрахані быў адкрыты філіял гандлёва-сэрвіснага цэнтра Мінскага трактарнага завода, што дазваляе нам у вялікім аб'ёме набываць і тэхніку, і спадарожную прадукцыю».

Кіраўнік рэгіёна ўказаў на эфектыўнае ўзаемадзеянне па лініі жыллёва-камунальнай гаспадаркі з ААТ «Магілёўліфтмаш». «Рамантуючы нашы шматкватэрныя дамы, выкарыстоўваем тэхніку гэтага завода, — удакладніў ён. — І плануем для наступнага перыяду пастаўкі ліфтаў менавіта Магілёўскага завода».

Асобнай увагі, па словах Ігара Бабушкіна, заслугоўвае пытанне міжрэгіянальных сувязяў. «У нас выбудаваны добрыя брацкія адносіны з Віцебскай, Магілёўскай, Брэсцкай абласцямі, — адзначыў ён. — Мы, знаходзячыся на поўдні Расіі і практычна з'яўляючыся варотамі на Каспій, праводзім форумы, шматлікія мерапрыемствы з арганізацыяй яшчэ большага прасоўвання тавараў з гэтых абласцей на прасторы прыкаспійскага рэгіёна».

Кажучы аб узаемадзеянні ў гуманітарнай сферы, губернатар Астраханскай вобласці распавёў, што ў рэгіёне з вялікім задавальненнем прымаюць беларускіх артыстаў. Астраханскія артысты, па яго словах, таксама рады выступаць для гледача Беларусі. Гэта ж адносіцца і да спартсменаў.

«Патрыятычнае выхаванне нашай моладзі, заснаванае на прынцыпах памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі заслугоўвае асаблівай увагі, — лічыць Ігар Бабушкін. — З 2022 года нашы юныя армейцы 22 чэрвеня наведваюць Брэсцкую крэпасць. Для іх гэта асаблівая, важная, памятная падзея, якую, упэўнены, будзем працягваць рэалізоўваць».

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

# ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН на сустрэчы з губернатарам Астраханскай вобласці Ігарам Бабушкіным заклікаў да пошуку новых кірункаў супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам.**

— Вы не першы раз у Беларусі, таму для мяне на самай справе вельмі важна ваша меркаванне наконт новых перспектыў, гарызонтаў і кірункаў, якія вы бачыце ў супрацоўніцтве з Рэспублікай Беларусь, — звярнуўся прэм'ер да Ігара Бабушкіна.

Такімі перспектыўнымі кірункамі Аляксандр Турчын лічыць пастаўкі беларускай тэхнікі ў расійскі рэгіён і павелічэнне аб'ёмаў перавалкі беларускіх грузаў праз астраханскія парты.

— Але ёсць і іншыя кірункі, у якіх мы маглі б паспяхова супрацоўнічаць. Ваш візіт і сустрэча з кіраўніком дзяржавы надасць імпульс развіццю нашых узаемаадносін, — упэўнены кіраўнік беларускага ўрада.



Ёсць шмат кірункаў развіцця супрацоўніцтва Беларусі і Астраханскай вобласці, лічыць Ігар Бабушкін.

— У нас ёсць рост тавараабмену, але разам з тым мы бачым і разумеем, што ёсць яшчэ пытанні. У нас вельмі добра наладжана ўзаемадзеянне ў сферы ўзаемных кантактаў па сельскай гаспадарцы — гэта абмен насенным фондам, — адзначыў ён.

Таксама губернатар падкрэсліў, што 70 працэнтаў сельскагаспадарчай тэхнікі, якая выкарыстоўваецца цяпер у галіне, — гэта машыны вытворчасці Мінскага трактарнага завода. Тры гады таму на тэрыторыі Астраханскай вобласці быў адкрыты гандлёва-сэрвісны цэнтр, што і паклала аснову паспяховаму супрацоўніцтву. За гэты час было закуплена 450 трактароў.

Па лініі жыллёва-камунальнай гаспадаркі бакі хутка наладзілі эфектыўнае ўзаемадзеянне па пастаўках ліфтавага абсталявання «Магілёўліфтмаша».

— Мы самі былі там, ацанілі якасць прадукцыі, выбралі мадэлі, якія прымальныя для пераўзбраення нашых шматкватэрных дамоў пры капрамонце. Сёння ў нас у рабоце 32 дамы, 122 ліфты ўстаноўлена. На найбліжэйшую перспектыву яшчэ 300 ліфтаў мы гатовы закупіць, — звярнуў увагу губернатар.

Па лініі транзітных грузаў Ігар Бабушкін адзначыў, што Астраханская вобласць гатова павялічыць аб'ёмы перавалкі беларускіх грузаў праз свае парты.

— Умовы ў нашых партах створаны, у тым ліку спецыяльныя для транзіту такіх грузаў, як папера, дрэва, тэхніка, угнаенні. Нашы патэнцыяльныя магутнасці ў партах складаюць 16 мільёнаў тон. У мінулым годзе праз нашы парты было перавалена 6 мільёнаў тон — гэта абсалютны рэкорд, — заявіў ён. — Нам ёсць што прапанаваць з пункту гледжання базы для перавалкі грузаў. Акрамя таго, радуе, што прамысловыя прадпрыемствы ўваходзяць у кааперацыю.

Адзін з новых перспектыўных кірункаў, якія павінны развіваць Беларусь і Астраханская вобласць, на думку Ігара Бабушкіна, — гэта турызм. Расійскі рэгіён, у прыватнасці, можа прапанаваць беларусам азнаёміцца з магчымасцямі рыбалкі на сваёй тэрыторыі, а таксама наведаць мясцовыя выдатныя мясціны.

— Гэта можа быць цікава для Беларусі. А прыгожыя і выдатныя мясціны Беларусі могуць быць цікавыя астраханцам, — адзначыў ён.

Гуманітарнае супрацоўніцтва таксама нязменна суправаджае ўзаемаадносіны Беларусі і Астраханскай вобласці, дадаў губернатар.

— Мы дамаўляемся аб культуры, спорце, абмене візітамі дэлегацый моладзі, мерапрыемствах патрыятычнай накіраванасці, — падкрэсліў кіраўнік вобласці.

**Паводле БелТА,**
**фота БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# АКТ МІЛАСЭРНАСЦІ, ЯКІ НЕ АСПРЭЧВАЕ ЗАКОННАСЦЬ СУДОВЫХ РАШЭННЯЎ

## Сенатары адобрылі законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 80-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне»

Як адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, праект закона падрыхтаваны па даручэнні Прэзідэнта. «Правядзенне амністыі напярэдадні найважнейшага дзяржаўнага свята, Дня Вялікай Перамогі, адлюстроўвае асаблівую гуманістычную скіраванасць крымінальна-прававой палітыкі нашай дзяржавы, — звярнула ўвагу спікер. — Прымяненне амністыі не аспрэчвае законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў, а з'яўляецца актам міласэрнасці ў дачыненні да асоб, якія здзейснілі злачынствы, а таксама іх сваякоў (сужэнцаў, дзяцей, бацькоў), якія, безумоўна, маюць патрэбу ў падтрымцы блізкіх».

Пры гэтым, як удакладніла Старшыня Савета Рэспублікі, амністыя прымяняецца толькі ў дачыненні да асоб, якія станоўча характарызуюцца ў перыяд адбывання пакарання і сталі на шлях выпраўлення. «Пачынаючы з 2019 года, гэта ўжо пятая амністыя, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Як паказвае статыстыка, яна не аказвае ўплыву на пагаршэнне крымінагеннай абстаноўкі ў краіне. Амністыя — гэта не проста шанц на датэрміновае вызваленне ад пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, а цэласная сістэма па стрымліванні амніставаных асоб ад здзяйснення новых злачынстваў».

Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ**, аналіз рэалізацыі папярэдніх амністый паказвае, што людзі, якія вызваляюцца па амністыі, як правіла, законапаслухмяныя і не робяць ранейшых памылак. Кіраўнік міліцэйскага ведамства звярнуў увагу на тое, што амністыя ўпершыню будзе прымяняцца ў дачыненні да асоб, якія дасягнулі 70-гадовага ўзросту, асуджаных на тэрмін не больш за шэсць гадоў, поўнасцю пагасілі прычыненую дзяржаве шкоду. Такіх, па словах міністра, 11 чалавек.

«Таксама амністыя будзе прымяняцца (у выглядзе скарачэння тэрміну на адзін год) да асоб, якія асуджаны за незаконны абарот наркотыкаў, — канкрэтызаваў Іван Кубракоў. — Амністыя будзе прыменена да асуджаных па ўсіх частках Крымінальнага кодэкса, за выключэннем, артыкула 328 часткі 5 (гэта злачынствы, якія пацягнулі смерць чалавека). Мы доўга разглядалі дадзенае пытанне, бо гэта катэгорыя асуджаных, да якіх прымяняецца амністыя, найбольш прадстаўнічая: амністыя закране звыш дзвюх тысяч чалавек, што асуджаны за наркотыкі. Прычым, амністыя будзе прыменена толькі да тых асоб, якія ўпершыню прыцягнуты да крымінальнай адказнасці».

Пры гэтым міністр унутраных спраў заўважыў, што масавага выхаду на свабоду асоб, якія цяпер знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, не будзе: тэрмін пакарання скарачаецца толькі на год. «Упэўнены, амністыя станоўча паўплывае на асоб, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, бо адна з умоў — прыкладныя паводзіны і пагашэнне шкоды, прычыненай злачынствам», — удакладніў ён. Іван Кубракоў дадаў, што амністыя закране і тых, хто асуджаны за аліменты. Аднак абавязковай умовай яе прымянення з'яўляецца поўнае пагашэнне запазычанасці.

**Вераніка КАНЮТА.**

# УЗНАГАРОДЫ БУДАЎНІКАМ

## З удзелам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ

У сталічнай канцэртнай зале «Верхні горад» адбылася цырымонія ўзнагароджання асоб, якія ўнеслі значны асабісты ўклад у будаўніцтва знакавых для горада Мінска аб'ектаў.



Фота БелТА.

«На самай справе за гэтымі аб'ектамі — велізарная праца людзей, якія па сутнасці, як сказаў наш Прэзідэнт, здзейснілі подзвіг, — звяртаючыся да прысутных, адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА**. Яна выказала падзяку кіраўніцтву горада за рэалізацыю маштабных праектаў, сярод якіх — перавядзенне Мінска на артэзіянскае водазабеспячэнне, адкрыццё новых станцый метро, будаўніцтва новага корпуса завода МАЗ.

Наша краіна славіцца сваімі працоўнымі традыцыямі, падкрэсліла спікер Савета Рэспублікі: «Мы разумеем, якая важная праца будаўнікоў. І наогул праца для любой краіны. А наша краіна слаўная сваімі працоўнымі традыцыямі. Мы адзначалі 1 Мая — дзень, калі ўшаноўваем працаўнікоў, гаворым пра карысць працы і неабходнасць працаваць для кожнага, каб ствараць даброты для сваёй краіны і народа. І сёння мы праводзім гэтае ўрачыстае ўшанаванне напярэдадні вялікага свята — 80-годдзя Перамогі.

**Наша краіна практычна была сцёртая з твару зямлі, знішчаліся гарады, разбураліся вёскі... Больш за 12,5 тысячы вёсак і населеных пунктаў было знішчана фашыстамі. Але наш народ выстаяў, адрадзіў краіну, адбудаваў гарады, заводы, прадпрыемствы.**

У беларускага народа сапраўды слаўныя працоўныя традыцыі, і я шчыра рада таму, што ў нас у горадзе Мінску жывуць людзі-працаўнікі — тыя, хто стварае даброты сваімі рукамі, сваім розумам».

Наталля Качанава падкрэсліла, што занясенне горада Мінска на Рэспубліканскую дошку Гонару яшчэ раз пацвярджае, што праца мінчан ацэнена на высокім узроўні: «Гэты ўказ падпісаў Прэзідэнт нашай краіны. І вы чулі, якія словы ён сказаў у адрас будаўнікоў, якія стварылі вельмі няпростыя аб'екты: перавялі ўвесь горад на падземнае водазабеспячэнне, і людзі атрымліваюць чыстую пітную ваду, пабудавалі новыя станцыі метро, і людзі больш камфортна могуць дабірацца ў любы пункт горада, пабудавалі новую вытворчасць па выпуску аўтобусаў — тэхнікі, якая сёння запатрабавана не толькі на ўнутраным рынку, але і далёка за межамі нашай краіны. Вядома, гэта вельмі важна».

Спікер канстатавала: нашай краінай можна ганарыцца па праве. «Аб горадзе Мінску далёка за межамі нашай краіны разносіцца слава як аб чыстым, добраўпарадкаваным, камфортным горадзе. І гэта ўсё вы, працаўнікі, якія, не шкадуючы сябе, робіце ўсё для таго, каб умацаваць эканоміку нашай краіны, стварыць камфорт і дабрабыт для нашых грамадзян», — падагульніла Наталля Качанава.

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# «ГЭТА САМАЕ МАЛОЕ З ТАГО, ШТО МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ У ЗНАК ПАДЗЯКІ»

## У Беларусі пачалі выплачваць матэрыяльную дапамогу да Дня Перамогі

Учора ў сценах тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска было асабліва шматлюдна. Напярэдадні свята Вялікай Перамогі тут ушаноўвалі ветэранаў і ўдзельнікаў вайны. Для іх было арганізавана святочнае чаяванне з выступленнямі маладзёжных калектываў. Пятнаццаці сведкам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны віцэ-прэм'ер Уладзімір Каранік і міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі медалі «80 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» і матэрыяльную дапамогу да Дня Перамогі.



Ёсць падзеі, значэнне і веліч якіх не цьмянее, нягледзячы на ход часу. І, колькі б дзесяцігоддзяў ні прайшло, мы заўсёды павінны памятаць пра Перамогу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, таму што значэнне гэтай падзеі вельмі цяжка пераацаніць. Аб гэтым заявіў **намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КАРАНІК**: «Мы павінны памятаць і выказваць словы падзякі тым, хто, нягледзячы на ўсе цяжкасці, выстаяў і перамог, аказваць падтрымку тым, чыё дзяцінства і юнацтва апаліла вайна. Нягледзячы на гэта, яны прайшлі праз усе цяжкасці, не азлобіліся, удзельнічалі ў аднаўленні краіны, фактычна паднялі яе з руін, перадалі вопыт наступным пакаленням. Наш маральны абавязак — клапаціцца пра тых, хто перамог у той вайне, хто вярнуў нам свабоду і правы жыць на сваёй зямлі».

Намеснік Прэм'ер-міністра падкрэсліў важнасць захавання памяці аб Вялікай Перамозе: «Мы абавязаны зрабіць усё для таго, каб памяць перадавалася з пака-

# І ЖУРНАЛІСТАМ

## у Мінску прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы

**Наталля Качанава ўчора таксама ўручыла ўзнагароды кіраўнікам і супрацоўнікам СМІ. Мерапрыемства з нагоды Дня друку, Дня работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі адбылося ў Савеце Рэспублікі. Спікер павіншавала прадстаўнікоў медыйнай супольнасці з прафесійнымі святамі, звярнуўшы ўвагу на тое, што яны адзначаюцца напярэдадні найгалоўнейшага свята — Дня Перамогі, якое з'яўляецца фундаментам незалежнай Беларусі.**

Старшыня Савета Рэспублікі выказала падзяку за сумесную работу. «Вы даносіце праўду людзям аб тым, як мы жывём, якія падзеі адбываюцца ў нашай краіне, аб тым, як мы жылі раней, — звяртаючыся да кіраўнікоў і супрацоўнікаў СМІ, адзначыла Наталля Качанава. — І гэта вельмі важна, бо ў апошнія гады мы бачым, якая ідзе інфармацыйная вайна. Вам аб гэтым казаць няма неабходнасці, бо вы на перадавой. І абсалютна правільна Аляксандр Рыгоравіч называе вас салдатамі інфармацыйнага фронту».

Спікер канстатавала, што праз сродкі масавай інфармацыі развязваюцца войны, на планеце з'яўляюцца новыя гарачыя кропкі, бо людзі не ведаюць праўды. Па яе словах, фальсіфікацыі, хлусня запаланілі інфармацыйную прастору, і людзям цяжка зарыентавацца ў гэтай плыні інфармацыі, якая льецца кожны дзень. «І дзякуючы супрацоўнікам дзяржаўных медыя свет даведваецца ўсю праўду аб Беларусі», — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава нагадала пра подзвіг журналістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, якія, фіксуючы факты, рабілі ўсё для таго, каб захаваць гэту памяць, якую цяпер даносяць іх сучасныя калегі. «Сёння спрабуюць перапісаць гісторыю. Мы бачым, як гэта нахабна адбываецца, — падкрэсліла спікер. — Узяць хаця б заяву Трампа, які сказаў, што вайну выйгралі амерыканцы, таму 8 мая яны аб'явілі Днём Перамогі».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, журналісты дзяржаўных СМІ годна працягваюць справу калег. «Тады, калі краіне было цяжка ў 2020 годзе, першымі, хто апынуўся пад ударам, былі вы, — нагадала яна. — І вы не загаваліся. Вы — тыя, хто стаў плячо ў плячо з нашым Прэзідэнтам, — рабілі ўсё для таго, каб вытрымаць. А чаму спрабавалі ў першую чаргу вас устараніць? Бо разумелі, што праз вас пойдзе праўдзівая інфармацыя, вы будзеце рабіць усё для таго, каб народ усвядоміў: трэба захаваць сваю краіну, утрымаць яе».

**Спікер падкрэсліла, што сучасныя журналісты не могуць здрадзіць пакаленню тых, хто адстаяў краіну ў гады Вялікай Айчыннай вайны, аднаўляў яе ў пасляваенны час, на развале Савецкага Саюза разам з Прэзідэнтам па крупінках ствараў нашу краіну.**

Наталля Качанава пажадала творчым калектывам, каб побач з імі былі сапраўдныя байцы — салдаты інфармацыйнага фронту.

«Лягчэй не будзе, — заўважыла яна. — Але самае галоўнае, што ў вас ёсць стрыжань і вы ведаеце, што трэба рабіць. Пацвярджэнне таму — тое, што мы бачым на экранах, што вы даносіце да людзей са старонак газет і з радыёпрыёмнікаў. Самае важнае, што вам давярае наш народ».

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Вераніка КАНЮТА.**

***Ад рэдакцыі.** Віншуем нашу калегу, рэдактара аддзела палітыкі газеты «Звязда» Вераніку Канюту, якая ўзнагароджана Падзякай Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.*




лення ў пакаленне, жыла ў вяках, таму што менавіта пакаленне пераможцаў стварыла той трывалы падмурак, абапіраючыся на які мы сёння будуем сваю незалежную і свабодную дзяржаву». Юбілей Вялікай Перамогі, паводле слоў Уладзіміра Караніка, — гэта выдатная нагода яшчэ раз сказаць словы падзякі ветэранам той страшнай вайны, сказаць, што мы ганарымся іх подзвігам, памятаем яго і ніколі не забудзем пра тое, праз што ім давялося прайсці».

Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што дзяржава памятае пра ветэранаў, клапоціцца пра іх: «Са свайго боку мы зробім усё, каб забяспечыць медыцынскае назіранне, своечасовую медыцынскую дапамогу, будзем і далей вырашаць вашы сацыяльныя пытанні. Напэўна, гэта самае малое з таго, што мы можам зрабіць у знак падзякі за той подзвіг, які здзейснілі вы і ўвесь беларускі народ у гады Вялікай Айчыннай вайны». Уладзімір Каранік пажадаў ветэранам як мага даўжэй заставацца побач са спадчыннікамі сваіх подзвігаў і сустракаць яшчэ неадноючы юбілей Вялікай Перамогі.



**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА** падчас мерапрыемства абвясціла цэнтралізаваны старт выдачы выплат, матэрыяльнай дапамогі да Дня Перамогі розным катэгорыям ветэранаў: «Рашэнне ўрада прынята. І дазвольце ў гэтай зале пачаць урачыстую місію чарговы раз».



**Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны Ефрасіння БАЗЫЛЕВА** падзялілася ўспамінамі аб сваім нялёгкім дзяцінстве падчас акупацыі Магілёва: «У нашай сям'і было 9 чалавек, і я самая малодшая. І ўсе мы як адзін падняліся на абарону нашай роднай Беларусі. Мая старэйшая сястра Вера была падпольшчыцай, працавала на чыгуначнай станцыі. Мяне, 13-гадовую дзяўчынку, прызначылі ў сувязісткі. Я добра ведала горад, бегала і перадавала розныя звесткі для партызан. Летам ліставкі мне ўшывалі ў куртку, зімой хавалі ў валёнкі, і я з усёй адказнасцю выконвала пастаўленыя задачы...»

У 1943 годзе, успамінае Ефрасіння Базылева, сястру-падпольшчыцу арыштавалі фашысты: «Яны вельмі доўга тады катавалі яе, але яна не сказала ні слова. Ледзь жывую яе выкінулі з машыны і расстралялі. Калі б пад рукой у мяне тады была вінтоўка... Але, нягледзячы на ўсе страты і цяжкасці, мы працягвалі змагацца, набліжаючы запаветны Дзень Перамогі для таго, каб наступныя пакаленні жылі ў міры і ніколі не зведалі страшнага слова «вайна».

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ



Фота БелТА.

## Ігар СЕРГЯЕНКА правёў прыём грамадзян

**Сярод пытанняў, якія ўзнімалі жыхары, — рэгуляванне маёмасных адносін, выкананне пакаранняў, унясенне змяненняў у медыцынскі агляд прызыўнікоў і знос аварыйных будынкаў. Традыцыйна на асабісты прыём да Старшыні Палаты прадстаўнікоў запісаліся людзі з розных рэгіёнаў краіны.**



Фота БелТА.

Мінчанка звярнулася з просьбай часова захаваць частку сцен аварыйнага дома на сваім участку ў Глускім раёне. Па словах жанчыны, поўнае разбурэнне будынка створыць пагрозу бяспецы, бо фінансавых сродкаў на ўстаноўку новага плота пакуль няма. Таксама ўскладнена падключэнне электрычнасці да новага дома з-за наяўнасці двух будынкаў на ўчастку.

Як патлумачыў **старшыня Глускага райвыканкама Аляксей ЖУРАЎЛЁЎ**, частковае захаванне дома немагчымае па законе, паколькі будынак падлягае поўнаму зносу. Ігар Сергяенка даручыў разабрацца ў сітуацыі і пры неабходнасці аказаць заяўніцы падтрымку.

Жыхар сталіцы папрасіў садзейнічаць у пераводзе яго дачкі, асуджанай у Расійскай Федэрацыі за арганізацыю злачыннай супольнасці або ўдзел у ёй, для адбывання пакарання ў Беларусі. Ён растлумачыў, што перавод на радзіму аблегчыць умовы ўтрымання і палепшыць зносіны з сям'ёй.

Як адзначыў **начальнік упраўлення Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь Андрэй МІРУК**, для пераводу асуджанай неабходна дачакацца ўступлення прыгавора ў законную сілу. Пасля гэтага можна падаць хадайніцтва аб пераводзе ў адпаведнасці з міжнароднай Канвенцыяй аб перадачы асуджаных для адбывання пакарання ў краіне грамадзянства.

«Прыгавор у законную сілу яшчэ не ўступіў, — дадаў ён. — Трэба дачакацца рашэння, і, згодна з Канвенцыяй, асуджаны або яго прадстаўнік можа падаць хадайніцтва аб пераводзе».

Сям'я з Мінскага раёна не згодная з рашэннем Цэнтральнай ваенна-ўрачэбнай камісіі Узброеных Сіл у дачыненні да блізкага сваяка, у якога пры праходжанні медыцынскага агляду ў Ленінскім раённым ваенным камісарыяце сталіцы ўстаноўлена захворванне сэрца. Людзі, якія прыйшлі на асабісты прыём, папрасілі аказаць садзейнічанне ў правядзенні больш глыбокага медыцынскага абследавання з мэтай пацверджання або зняцця гэтага дыягназу, які перашкаджае праходжанню воінскай службы.

Жыхар Бягомля Докшыцкага раёна прыйшоў са скаргай на дзеянні службовых асоб Докшыцкага райвыканкама пры выдзяленні зямельных участкаў. А віцябчанін звярнуўся з просьбай аказаць садзейнічанне ў добраўпарадкаванні прыдамавой тэрыторыі і дзіцячай пляцоўкі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў уважліва выслухаў пытанні і прапановы грамадзян, запэўніў, што ўсе яны будуць дэталёва вывучаны і пастаўлены на кантроль.

**Паводле БелТА.**

Результаты рекламной игры

## «Мани мечты!»

**Организатор рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 40, офис 605, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

**Наименование рекламной игры:** «Мани мечты!»

**Срок проведения рекламной игры:** с 28.11.2024 по 14.05.2025 (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

**Территория проведения рекламной игры:** Республика Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4490 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 21 ноября 2024 года.

В рекламной игре приняло участие 46 765 (сорок шесть тысяч семьсот шестьдесят пять) физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

**Список победителей рекламной игры «Мани мечты!»:**

| | |
|---|---|
| **ПРИЗ 1: Денежный приз 100 000,00 (сто тысяч) белорусских рублей 00 копеек** и денежные средства в размере 14 908,16 белорусского рубля – 3 шт. | |
| 1 | СОБОЛЕВСКИЙ А.А. |
| 2 | СЕГЕНЬ Е.И. |
| 3 | ИЛЬЕНКОВА Л.А. |
| **ПРИЗ 2: Денежный приз 1 000,00 (одна тысяча) белорусских рублей 00 копеек** и денежные средства в размере 115,06 белорусского рубля – 70 шт. | |
| 1 | БУДЬКО А.А. |
| 2 | КОВАЛЕНКО Ю.Ю. |
| 3 | КОВАЛЕВ А.С. |
| 4 | ЮРЕВИЧ Я.Г. |
| 5 | ХРОМЫЛЁВ А.И. |
| 6 | СУБОТКА Я.А. |
| 7 | ЛУКАШИК А.А. |
| 8 | ЛЕХ В.С. |
| 9 | БЕЛОУС А.Н. |
| 10 | СКАКУН Н.Ф. |
| 11 | ЯКУБОВ Р.В. |
| 12 | ШАБОЛДОВА И.В. |
| 13 | ЛУПОВА О.А. |
| 14 | ШЕЛЕГ А.С. |
| 15 | ШАЙТОРОВ С.П. |
| 16 | ШАПОРОВА А.И. |
| 17 | ШЕЛЕГ Е.А. |
| 18 | ЯКУШЕВ Д.А. |
| 19 | ЮШКЕВИЧ С.В. |
| 20 | ЯРОЦКАЯ Е.И. |
| 21 | КЛИМЕНЧЕНКО М.В. |
| 22 | ЯЦКЕВИЧ Д.А. |
| 23 | ДОЛБИЛОВА В.Р. |
| 24 | ТОПУЗИДИС П.П. |
| 25 | ВАСЕНЁВА Е.И. |
| 26 | ПАПЕРНЫЙ М.А. |
| 27 | ТРУСЕВИЧ А.А. |

| | |
|---|---|
| 28 | БЕЛЬСКИЙ Д.Д. |
| 29 | РУСАК С.В. |
| 30 | САМОХВАЛ Ю.С. |
| 31 | БАБИЕНКО В.А. |
| 32 | РАМАНОВИЧ П.В. |
| 33 | ГАЙДУК А.О. |
| 34 | БЛАГОДЫРЬ А.А. |
| 35 | СЕРГЕЕНКО А.К. |
| 36 | БЕРЕСНЕВА В.А. |
| 37 | ЗМИЕВСКИЙ А.В. |
| 38 | АРТИКУЛЕНКО Д.П. |
| 39 | САМКОВА Ю.А. |
| 40 | ПОПОВСКИЙ С.А. |
| 41 | ЛИСЕЙЧИКОВ В.А. |
| 42 | КОХОВИЧ Д.Г. |
| 43 | ШЕВЦОВА Л.И. |
| 44 | ФРАНЦЕВИЧ Ю.Н. |
| 45 | ЗАВАДСКИЙ А.А. |
| 46 | САВРАН Т.В. |
| 47 | ШАРИПОВА О.Н. |
| 48 | СИПАЙЛО П.Л. |
| 49 | КАСПЕРОВИЧ С. |
| 50 | ШЕРЛАТ В.В. |
| 51 | КУДАСОВ С.И. |
| 52 | ПАЦКЕВИЧ В.С. |
| 53 | ИОНОВ И.С. |
| 54 | ОПОЙЦЕВ М.В. |
| 55 | ПАШКЕВИЧ Е.А. |
| 56 | ВАЙЦЕЛЬ Е.И. |
| 57 | КОВАЛЬЧУК А.Н. |
| 58 | ЗАЛОЗНАЯ А.С. |
| 59 | ЛАРИОНОВ М.А. |
| 60 | ЛАТЫШ Д.Н. |
| 61 | БУДРИН Н.П. |
| 62 | ЧЕРЯТНИКОВ Д.А. |
| 63 | ЧИМБУР Р.Г. |
| 64 | ДОБРЫЙ М.И. |
| 65 | ШИДЛОВСКИЙ С.Н. |
| 66 | ЮШКО А.С. |
| 67 | ГУБСКИЙ А.В. |
| 68 | МУРАВИЦКИЙ А.П. |
| 69 | КУНГУРОВ Д.А. |
| 70 | ШУЛЬГА М.В. |

**Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: 198, +375 (29, 44, 25) 733-33-32 круглосуточно.**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества**

## ОАО «Могилевоблавтотранс»

**Аукцион состоится 03.06.2025 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

Лот № 1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-148770 – Помещение № 2 (**с асфальто-бетонным покрытием двора площадью 599,2 кв. м), пл. – 534,3 кв. м. Кран-балка с электроталью и подкрановыми путями, инв. № 1000341, адрес: г. Могилев, ш. Гомельское, 5/2-2.

***Начальная цена продажи: 148 608,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 14 860,00 бел. руб.***

Лот № 2: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-112484 – Административное помещение**, пл. – 142,2 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Гомельское, 5/1-2.

***Начальная цена продажи: 66 048,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 6 604,80 бел. руб.***

Лот № 3: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-93968 – Помещение № 1,** пл. – 230,4 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Гомельское, 5.

***Начальная цена продажи: 115 200,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 11 520,00 бел. руб.***

Лот № 4: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-93985** – **Производственное помещение № 2**, пл. – 845,1 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Гомельское, 5.

***Начальная цена продажи: 218 880,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 21 888,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: по 02.06.2025 до 11.00. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Продавец: ОАО «Могилевоблавтотранс» (г. Могилев, ш. Гомельское, 1, тел. 8-0222-33-05-39).

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**


УРАЖАННІ

# «АДЧУВАЮ ГОНАР ЗА КРАІНУ, У ЯКОЙ ЖЫВУ»

## У рэзідэнцыю Прэзідэнта завіталі на экскурсію прадстаўнікі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі



Галоўная афіцыйная пляцоўка краіны — Палац Незалежнасці — зноў прыняла гасцей 2 мая. Гэтым разам магчымасць пабываць на экскурсіі выдалася спецыялістам нацыянальнага прафцэнтра і актывістам галіновых прафсаюзаў. Гэта падзея стала сімвалічнай у сувязі з мінулым святам Першамая.



Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі — самая масавая грамадская арганізацыя краіны. Яна аб'ядноўвае 15 галіновых прафсаюзаў (сельскай гаспадаркі, прамысловасці, аховы здароўя, адукацыі, лясной і хімічнай галін, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, сувязі і г. д.), усяго ў яе склад уваходзяць каля чатырох мільёнаў чалавек па ўсёй краіне.

Спачатку гасцям расказалі, як стваралася рэзідэнцыя Прэзідэнта. Паколькі аб'ектаў такога маштабу да 2013 года ў краіне не было, Прэзідэнтам на той час была пастаўлена даволі складаная задача: каб Палац Незалежнасці быў пабудаваны беларускімі майстрамі, пераважна з беларускіх матэрыялаў. Сваім вопытам па ўзвядзенні такіх пляцовак з нашымі спецыялістамі дзяліліся ў тым ліку і калегі з постсавецкай прасторы.

**Трохузроўневы будынак у стылі постмадэрнізму размясціўся ў так званым дзяржаўным квартале: побач з палацам — плошча Дзяржаўнага сцяга, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, знакамітая стэла «Мінск — горад-герой», выставачны комплекс «БелЭкспа», будынак Вярхоўнага Суда Беларусі, зусім недалёка вядзецца будоўля Нацыянальнага гістарычнага музея.**

Госці мелі магчымасць убачыць самыя пазнавальныя залы палаца, якія нярэдка фігуруюць у рэпартажах аб дзейнасці кіраўніка дзяржавы.

**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый СЯНЬКО** падкрэсліў, што для калектыву ФПБ наведванне рэзідэнцыі Прэзідэнта стала сапраўдным падарункам: «Кіраўнік дзяржавы ўдзяляе вялікую ўвагу прафсаюзам, за што мы вельмі ўдзячныя. Перакананы, што сённяшняя экскурсія дазволіць спецыялістам прафсаюзаў яшчэ больш усведамляць глыбіню і важнасць рашэнняў, якія прымаюцца тут нашым Прэзідэнтам».

Сваімі ўражаннямі ад убачанага падзялілася **саветнік тэхнічнай інспекцыі працы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Наталля РАДЗЮК**: «Мне вельмі спадабалася атмасфера. Тут цёпла, сонечна і ўтульна, нягледзячы на маштабы. Яшчэ адно прыемнае адкрыццё — у Палацы Незалежнасці ўбачыла карціны свайго земляка Яўгена Зайцава. Мы абое родам з Магілёва. Вельмі рада прадстаўленай магчымасці пабываць тут».

Пагутарыць таксама ўдалося з **галоўным спецыялістам Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Алесяй ГРАЧАННІКАВАЙ**, якая на экскурсіі пабывала ўпершыню: «Не хапае слоў, наколькі ўразіў маштаб Палаца Незалежнасці. Гэта насамрэч грандыёзнае збудаванне. Знаходзячыся цяпер тут, я адчуваю гонар за краіну, у якой жыву», — падзялілася думкамі жанчына.

**Яна ВАЛАСАЧ,**
**фота аўтара і БелТА.**



МЕРКАВАННЕ

# СМАК ВЯСКОВАГА ЖЫЦЦЯ

## У чым сэнс везці малако спачатку ў горад, а потым у тэтрапаку купляць у мясцовым сельпо?

Ці можна вясковае жыццё зрабіць такім жа, як гарадское? Вельмі моцна сумняваюся. Бо ў поўнай меры рабіць з вёскі горад таксама немагчыма, як і спрабаваць дабіцца ад мегаполіса экалагічнасці сельскай мясцовасці. Як жа прывабіць людзей у невялікія населеныя пункты? Так, нам патрэбен вясковы маркетынг: фарміраваць там тыя перавагі, якія недаступныя ў горадзе. Але, зноў жа, такое задавальненне абыходзіцца занадта дорага.

Цудоўны парадокс лічбавай эпохі: з горада вязуць прадукты харчавання ў вёску! Напэўна, упершыню такое адбываецца ў гісторыі чалавецтва. У мегаполісах пакуль не сеюць, не жнуць. Мяса і малако навучыліся сінтэзаваць у прабірцы. Але такая вытворчасць пакуль адрозніваецца экзатычнасцю і не далёка адышла ад навуковых эксперыментаў. Не, усё вырошчваецца па-ранейшаму на лугах і нівах. Але перапрацоўваецца потым на буйных прадпрыемствах — вялізных, магутных, прадукцыйных. Яны выпускаюць канкурэнтаздольную прадукцыю. Прынамсі з пункту гледжання гандлёвых сетак, якія ўсё больш кіруюць спажывецкім рынкам. У вялікага рытэйлу свае ўяўленні аб выдатным. Купцы сучаснай эпохі зарабляюць на вялікіх маштабах свайго бізнесу: дзясяткі і сотні крам, якія дазваляюць рэалізоўваць велізарныя партыі прадукцыі, атрымліваць у вытворцаў зніжкі, аб чым у нядаўнім мінулым прадаўцы і не марылі. А калі хтосьці не пагодзіцца — можна і не звярнуць на яго прадукцыю ўвагі. А прадаць без буйнога рытэйлу сваю прадукцыю — вельмі праблематычна.

Таму ўсё стала ў нашым жыцці маштабна і аднастайна. Асартымент у розных рэгіёнах надзіва падобны, прынцыпова не адрозніваецца. І тэрміны рэалізацыі (адзін з крытэрыяў буйнога гандлю) — бясконца фантастычныя, вымяраюцца месяцамі і гадамі. У супермаркеце практычна немагчыма знайсці прадукцыю, якая б псавалася за 2-3 дні. І нават за тыдзень-два. Мабыць, выключэнне толькі ахалоджанае мяса і садавіна.

Няма нічога дрэннага, што вытворцы прадуктаў харчавання і гандаль узбуйніліся: без такіх монстраў вялікія гарады не пракарміць. Але ці павінны быць толькі яны? Ці лагічна везці каўбасу і хлеб са сталіцы ці абласнога цэнтра ў вёску? Нават ці мэтазгодна эканамічна? Не пашкодзіла б палічыць. Зрэшты, гэта асобная тэма для вывучэння. Дзіўная тэндэнцыя нашага часу ў іншым: сумна ехаць у вёску.

Яшчэ нядаўна паездку ў вёску ці нават раённы цэнтр можна было лічыць кулінарнай падзеяй. У кожным раёне былі свае каўбасныя, малочныя цэхі, пякарні, кулінарыі... Усе прадукты — не проста натуральныя, а з пылу з жару. А ў мясцовых сельпо стаяла кансервацыя, выпушчаная на невялікіх прадпрыемствах: грыбочкі, салянкі, салацікі. І ў кожным рэгіёне была свая «разыначка», свае рэцэпты, свой гонар і дасягненні. Мясцовы кулінарны каларыт неяк калі не знік цалкам, то вельмі прыкметна пацьмянеў. Падазраю, у тым ліку і ў выніку імкнення наблізіць стандарты жыцця ў малых населеных пунктах да гарадскіх. У тым ліку і ў гандлі. Супермаркеты сталі такімі, як у сталіцы. І асартымент той жа. Дакладней — крыху больш сціплы. У той жа сталіцы ёсць такія харчовыя гмахі, у якіх можна заблукаць. Нават мілыя мястэчкі з насельніцтвам 5-10 тысяч чалавек не могуць забяспечыць попыт для акупнасці такіх гмахаў. А ці патрэбныя яны ўвогуле?



Трэнд урбанізаванай эпохі — здаровае харчаванне. Калі не ўся, то некаторая частка моладзі, ды і сярэдняга пакалення, па гэтай гісторыі літаральна шалее. А дзе можа быць больш здаровае і свежае харчаванне, як не ў вёсцы? Гэта перавага, па якую людзі могуць пацягнуцца туды. Вядома, адной перавагай народ за горад не прывабіш. Але як адзін з момантаў унікальнасці загараднага жыцця выкарыстоўваць можна. Там ёсць усе ўмовы. Менавіта ў вёсцы квітнеюць сады, пасвяцца каровы, нясуцца куры... Сімвал нашай эпохі — фрэш — у аграгарадках павінен на кожнай вуліцы прадавацца. І па дэмакратычных цэнах, у адрозненне ад горада: сыравіна побач. Пайшоў у сад, сарваў і «націснуў». А ў чым сэнс везці малако спачатку ў горад, а потым у тэтрапаку купляць у мясцовым сельпо?! Вядома, вазіць вяршкі ў бітонах на возе па дварах не зусім сучасна і не зусім адпавядае санітарным нормам. Але калі свежыя прадукты фасаваць у самую простую тару, можа атрымацца танна і сярдзіта з пункту гледжання смаку і карыснасці. Вельмі вялікія выдаткі на вялікіх прадпрыемствах складаюць тэхналагічныя хітрасці, каб падоўжыць тэрмін захоўвання прадукцыі. Але навошта гэта патрэбна ў сельскай мясцовасці? І нават у раённых цэнтрах, за ваколіцамі якога палі пачынаюцца?

Добрае пытанне, на якое, упэўнены, ёсць адказ. Падазраю, што ёсць пытанні ў частцы рэгуляцыі. Быў перыяд не самых высокіх дасягненняў у сельскай гаспадарцы, калі сыравіны катастрафічна не хапала буйным заводам. Ды і на паліцах магазінаў не вельмі густа было. І тады шмат намаганняў прыкладалі, каб запоўніць буйны бізнес. Але сёння сыравіннай базы, у прынцыпе, хапае. Магчыма, ёсць сэнс мясцовую перапрацоўку адраджаць? Гэта і працоўныя месцы, і пэўная перавага жыцця ў невялікіх гарадах. І прадукцыю можна зрабіць таннейшай. Тое ж казінае ці авечае малако (дарэчы, вельмі карыснае для дзяцей, асабліва схільных да алергіі) у сталіцы можа каштаваць вельмі дорага. Падазраю, што на сяле яно павінна быць на парадак таннейшым.

Бесспрэчна, неабходна ствараць умовы і для рэалізацыі прадукцыі невялікіх вытворцаў. І нават прадуктаў хатняй вытворчасці. Пякуць жа ў гарадах самазанятыя тарты. Можна і грыбочкі з варэннем круціць. І рэалізоўваць. Але для гэтага павінны быць адпаведныя гандлёвыя пункты. Не выключана, што тыя ж сельпо, якія, наогул, крамы кааператыўныя, але забяспечваюцца па цэнтралізаваным прынцыпе. Проста трэба за гэта пытанне ўзяцца, вывучыць, ацаніць нарматыўную базу. А попыт будзе. Глыбока ў гэтым перакананы. Мінулі часы, калі мы безумоўна пакланяліся прыгожай упакоўцы і падалі на калені перад брэндамі. Ёсць беларусы, якім хочацца есці не крута, а смачна. І, пажадана, нядорага. Падазраю, што сельская мясцовасць ідэальна падыходзіць для гэтага. Несумненна, буйны бізнес будзе супраць. Але меркаванні могуць быць рознымі.

А ёсць пажаданні грамадзян. І не факт, што яны не на карысць невялікіх вытворцаў фармату каля дома. Вось нядаўна Прэзідэнту ў пасёлку Копысь паказалі пякарню, якая выдатна функцыянуе, стварае дабаўленую вартасць і, што самае галоўнае, радуе людзей. Менавіта той выпадак, калі спрыяльны досвед можна і трэба маштабаваць і пашыраць на іншыя сегменты прадуктаў харчавання. І такі бізнес можа стаць адной са значных перавag жыцця ў вёсцы.

**Інтэлект ШТУЧНЫ**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. Тел. +375 17 310-36-37 |
| **Продавец** | РО «БЕЛАГРОСЕРВИС», г. Минск, ул. Козлова, д. 25а. УНП 190431542 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Местонахождение: Минский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 29а

| Лот № | Наименование лота | Начальная цена с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Агрегат посевной AMAZONE Cirrus 6001 Super**, 2007 г. в. | **46 099,20** |
| 2 | **Сеялка точного высева Kverneland Unicorn «id 7240»,** 2010 г. в. | **4 845,60** |
| 3 | **Погрузчик АМКОДОР 332С**, 2005 г. в. | **54 000,00** |
| 4 | **Трактор «Беларус-82.1»,** 2009 г. в. | **14 760,00** |
| 5 | **Комбайн зерноубор. КЗС-1218-10 «Палессе»,** 2010 г. в. | **88 800,00** |
| 6 | **Трактор «Беларус-952»,** 2006 г. в. | **13 800,00** |
| 7 | **Автомобиль МАЗ-5551 03-2125Р**, 2005 г. в. | **15 300,00** |
| 8 | **Прицеп-самосвал МАЗ 8571 020**, 2005 г. в. | **4 500,00** |
| 9 | **Трактор «Беларус-2022.3»**, 2007 г. в. | **26 640,00** |
| 10 | **Трактор «Беларус 3022 ДЦ»**, 2012 г. в. | **16 800,00** |
| 11 | **Трактор «Беларус 82.1»**, 2009 г. в. | **14 880,00** |
| 12 | **Почвообр. агрегат АПН-3** , 2011 г. в. | **8 640,00** |
| 13 | **Плуг полунавес. оборот. ППО-8-40К**, 2010 г. в. | **6 600,00** |
| 14 | **Трактор «Беларус МТЗ 82.1»**, 2009 г. в. | **15 480,00** |
| 15 | **Трактор «Беларус МТЗ 82.1»**, 2013 г. в. | **22 800,00** |
| 16 | **Автомобиль MAZ 551605 4275РБ,** 2013 г. в. | **40 560,00** |
| 17 | **Автомобиль MAZ 6501 А8-325-000**, 2013 г. в. | **50 760,00** |

**Шаг торгов – 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона: 10 (десять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 16.05.2025.**
**Дата и время окончания приема заявок:** по **15.05.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (gki.gov.by)**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by



**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ОДО «ОРБИУС»**
*(УНП 101258669, г. Минск, ул. Л. Беды, д. 11, корпус 1, комн. 106).*

***Дата и время проведения торгов*: 04 июня 2025 года.**

Начало – 11.00. Заявки принимаются с 03 мая 2025 года по 02 июня 2025 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** **ОДО «ОРБИУС» (УНП 101258669), в лице ликвидатора — директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско А.А.**

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте https://specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64)
по поручению **ГУ «Копыльский территориальный центр социального обслуживания населения»**
(223927, г. Копыль, ул. 50 лет БССР, 16А)
проводит открытый аукцион

**по продаже легкового специального автомобиля PEUGEOT PARTNER,**

**2007 г. в., рег. знак 6668 МК-5, инв. № по бух. учету 01510004, кузов (VIN) VF3GJ9HXC95284837, находящегося по адресу: Минская область, г. Копыль, ул. пл. Ленина.**

**Начальная цена** (без НДС) – **4 950,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **495,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.
Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.
Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 28.12.2024, 15.02.2025.
Электронные торги состоятся **20.05.2025** в **10.00**.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.05.2025** до **17.00.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**

УНП 690295749

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 15 мая 2025 г. в 10.00 повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 20 % после первых несостоявшихся торгов**

**по продаже автомобиля BOGDAN 231010-31,**
**принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности**

| № лота | Наименование и характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС 20 %) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС 20 %) |
| --- | --- | --- | --- |
| 1 | **Автомобиль BOGDAN 231010-31,** регистрационный знак АМ 2488-3, 2010 года выпуска. Тип: грузовой фургон. Цвет: белый. Номер кузова (рамы) Y6L231010AL200219. Объем двигателя: 1597 см³. Вид топлива: бензин. Коробка передач: механическая | **7 008,00** | **700,00** |
| **Местонахождение автотранспортного средства:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25 | | | |

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 14.05.2025 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **15.05.2025 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.
**При подаче заявления участник должен иметь:** 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению, в газете «Звязда» от 03.05.2025 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшим победителями аукциона (лицами, приравненными к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 5 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.
Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 19.02.2025 г. № 34

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47.**
**сайт: gostorg.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гомельстекло», г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25, тел.: +375 29 615-55-20; +375 29 171-07-69**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **государственному объединению «Белорусская железная дорога»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 04.06.2025**

**Лот № 1:** Цистерна № 79404281.
**Лот № 2:** Цистерна № 79404901.
**Лот № 3:** Цистерна № 79404117.
**Лот № 4:** Цистерна № 79404026.
**Лот № 5:** Цистерна № 79418679.
**Лот № 6:** Цистерна № 79405767.
**Лот № 7:** Цистерна № 79403960.
**Лот № 8:** Цистерна № 79405049.
**Лот № 9:** Цистерна № 79405403.
**Лот № 10:** Цистерна № 79411641.

**Начальная цена без НДС** Лотов №№ 1–10 – 28 100,00 руб. (за один Лот).
**Место нахождения Лотов №№ 1, 2:** ст. Журжево (г. Витебск, Октябрьский р-н);
**Лотов №№ 3–5:** ст. Заболотинка (Витебский р-н, Октябрьский с/с, поселок ж/дй ст. Заболотинка, Железнодорожная ул.);
**Лота № 6:** ст. Ловша (Витебская обл., Шумилинский р-н, Ловжанский с/с, аг. Никитиха);
**Лота № 7:** ст. Витебск (г. Витебск, ул. Горького, 14);
**Лота № 8:** ст. Бигосово (Витебская обл., Верхнедвинский район, агрогородок Бигосово, ул. Клубная, 1);
**Лота № 9:** ст. Ксты (Витебская обл., Полоцкий район, Экиманский сельсовет, промузел Ксты, ул. Строительная);
**Лота № 10:** ст. Оболь (Горяны) (Витебская обл., Полоцкий район, деревня Горяны, пер. Железнодорожный, 6).

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

# ЗОРКА ПОДЗВІГУ АЛЯКСЕЯ РАКІЦЯНСКАГА





*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля вайны Аляксей Анісімавіч жыў і працаваў у Мінску. У беларускай сталіцы цяпер жывуць яго нашчадкі. Менавіта яны перадалі ў Белдзяржмузей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны матэрыялы пра свайго гераічнага продка, у тым ліку самую каштоўную сямейную рэліквію — медаль «Залатая Зорка».

## ГАРМАТНЫ БОЙ І АТАКА ЎРУКАПАШНУЮ

Аляксей Ракіцянскі нарадзіўся 28 лютага 1922 года ў Палтаўскай вобласці, у сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў рахункаводам. У 1941-м маладога чалавека прызвалі ў Чырвоную Армію, залічылі ў Ваўчанскую ваенную школу авіямеханікаў, дзе ён правучыўся сем месяцаў. Затым скончыў Харкаўскае ваеннае артылерыйскае вучылішча, якое было эвакуіравана ў г. Фергана Узбекскай ССР. Прайшоўшы паскораны курс навучання, у верасні 1942 года Аляксей Ракіцянскі быў адпраўлены на фронт.

З восені 1943 года ў складзе войскаў Заходняга фронту ўдзельнічаў у баях за вызваленне Беларусі. Камандзір агнявога ўзвода 45-мм гармат 418-га стралковага палка 133-й стралковай дывізіі Аляксей Ракіцянскі змагаўся з ворагам на аршанскім напрамку. Пад Дуброўна, што на Віцебшчыне, быў паранены. Пасля таго, як паправіўся, малады чалавек працягваў ваяваць на тэрыторыі Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей.

У перыяд аперацыі «Баграціён» гвардыі лейтэнант камандаваў узводам 2-га гвардзейскага знішчальна-супрацьтанкавага артылерыйскага палка 16-й гвардзейскай знішчальна-супрацьтанкавай артылерыйскай брыгады 5-й арміі 3-га Беларускага фронту. 17 ліпеня 1944 года падчас вызвалення Літоўскай ССР недалёка ад горада Алітус Аляксей Ракіцянскі адным з першых пераправіў групу разведчыкаў сваёй батарэі на заходні бераг ракі. Заняў плацдарм і ўтрымліваў яго да раніцы 18 ліпеня, да падыходу пяхоты 184-й стралковай дывізіі, якой і быў перададзены плацдарм.

У гэты дзень батарэю атакавалі 30 танкаў праціўніка. У выніку жорсткага бою батарэя Ракіцянскага знішчыла чатыры варожыя танкі, да 20 нямецкіх салдат і афіцэраў. Аднак ворагу ўдалося вывесці са строю ўсе гарматы батарэі. Гвардыі лейтэнант Ракіцянскі не разгубіўся: сабраў групу байцоў і з крыкам «ура» атакаваў аўтаматчыкаў праціўніка, адбіў захопленыя імі аўтамашыны. Затым, сабраўшы групу стралкоў 184-й стралковай дывізіі, пераследаваў ворага. Камандзір узвода асабіста знішчыў у рукапашным баі трох гітлераўцаў. Нямецкія аўтаматчыкі з вялікімі стратамі пакінулі месца бою. За гэты подзвіг Аляксею Ракіцянскаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Завяршыўшы службу ў арміі, Аляксей Анісімавіч застаўся ў Мінску. Пайшоў з жыцця ў 1998 годзе.

## «НЕ ЛЮБІЎ УСПАМІНАЦЬ ВАЙНУ»

**Навуковы супрацоўнік аддзела ўліку фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Паліна РУСЕЦКАЯ** расказала, што медаль «Залатая Зорка» ў студзені 2025 года ў фонд музея перадала дачка Героя Савецкага Саюза Людміла Ракіцянская. Акрамя медаля, нашчадкі франтавіка перадалі ва ўстанову больш як сто адзінак яго асабістых прадметаў. Сярод іх — парадная форма, трафейны гадзіннік, дакументы ваеннага часу і фотаздымкі.

Людміла Ракіцянская адзначыла, што такія рэчы не варта захоўваць дома. «Мы даўно хацелі перадаць іх у музей, і вось час прыйшоў, — сказала дачка Героя Савецкага Саюза. — Думаю, яны не павінны захоўвацца дома, бо, увогуле, яны належаць усім».

Людміла Ракіцянская падзялілася ўспамінамі пра бацьку: «Я была татавай дачкой. Заўсёды была з ім, а бацька — са мной. Ён вазіў мяне на мора, у падарожжы, паходы. Ён усё ведаў. Быў цудоўным грыбнікам і вельмі любіў збіраць ягады. Мы разам збіралі маліны, а потым варылі варэнне. Тата ўсё гэта ўмеў рабіць. Я не памятаю, каб мы калі-небудзь хадзілі ў майстэрню рамантаваць абутак або вопратку. Акрамя таго, бацька шмат чаго ведаў: што не спытаеш — у яго на ўсё ёсць адказ».

Адзінае, чаго не любіў Аляксей Ракіцянскі, — успамінаць вайну. «Нават калі ў нас былі госці і ў яго пыталіся: «Лёша, а як там на вайне?», ён не адказваў, — згадвае дачка героя. — Ён тады больш любіў сесці за стол і пачаць спяваць. Бацька ведаў мноства песень і меў нядрэнны голас».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**


ЗВЯЗДА
ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ

### • У тыле

**«Калгаснікі Рудзенскага раёна вестку аб заняцці доблеснымі савецкімі воінамі сталіцы разбойніцкай фашысцкай Германіі — Берліна — сустрэлі заканчэннем сяўбы ранніх збожжавых культур і лубіну на насенне на плошчы 9 796 гектараў.**

Паўсюдна праходзілі мітынгі. У Рудзенску на ім прысутнічала ажно 1 200 чалавек. Сюды прыйшлі калгаснікі бліжэйшых сельгасарцелей «Савецкая Беларусь», «Бязбожнік» і другіх», — пісала «Звязда». — З паведамленнем аб новай слаўнай перамозе нашых войскаў — заняцці Берліна — выступіў сакратар райкама партыі таварыш Ванкевіч.

Прысутныя наладжваюць у чэсць пабеданоснай Чырвонай Арміі і геніяльнага палкаводца таварыша Сталіна бурную авацыю. Выступіўшыя на мітынгу таварышы Дахтураў, Тарасаў, Комлік, Цімашчук горача віталі нашых слаўных воінаў. Нарэшце пала сталіца нямецкага імперыялізма, адкуль на працягу ўсёй гісторыі на ўсход і на захад цягнуліся разбойніцкія шчупальцы заняволення, захопніцтва і смерці».

### • На фронце

На працягу 3 мая на паўднёвым захадзе ад горада і порта Пілау войскі 3-га Беларускага фронту прадаўжалі весці баі па ачышчэнні ад праціўніка касы Фрыш Нерунг і занялі населеныя пункты Кальберг Ліп і Кайзерхоф.

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, войскі 2-га Беларускага фронту, развіваючы наступленне, авалодалі гарадамі Барт, Бад Даберан, Найбукоў, Вітэнберге і 3 мая на лініі Вісмар, Вітэнберге злучыліся з саюзнымі англійскімі войскамі. Франтавікі занялі таксама буйныя населеныя пункты Крэпелін, Бютцоў, Гюстроў, Гольдберг, Кароў, Путлітц, Прытцваль і іншыя. «**У баях за 2 мая войскі фронта ўзялі ў палон 10 600 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі 328 самалётаў. У ліку палонных камандуючы 5 Штэцінскай акругай па справах працоўнай павіннасці генерал-маёр Мато», — паведамляла «Звязда».**

На паўночным захадзе ад Берліна войскі 1-га Беларускага фронту, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі населеныя пункты Вільснак, Глевен, Штудэнітц, Нітцоў, Вельгаст, Штродэне, Рыноў, Шпатц, Хоэн-Науен і, калі выйшлі на Эльбу на паўднёвым захадзе ад горада Вітэнберге, злучыліся з саюзнымі амерыканскімі войскамі.

**Пасля 21 гадзіны 2 мая ў Берліне франтавікі дадаткова ўзялі ў палон звыш 20 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, апрача таго, у шпіталях імі было ўзята 10 700 раненых нямецкіх салдат. Усяго ў Берліне ў гэты дзень войскамі фронту было захоплена 100 700 нямецкіх салдат і афіцэраў. У ліку палонных — камандзір паветранай урадавай эскадры генерал-лейтэнант Баўр, начальнік медыцынскай службы паліцыі Берліна генерал-маёр медыцынскай службы Врубель, генерал-лейтэнант паліцыі Ратэнгубер, начальнік канцылярыі Гебельса Сайлер.**

За 2 мая войскі 1-га Украінскага фронту ў раёне Берліна ўзялі ў палон больш чым 34 тысячы нямецкіх салдат і афіцэраў, захапілі 37 танкаў і звыш 140 палявых гармат. У ліку палонных — камандзір 236 нямецкай пяхотнай дывізіі генерал-маёр Лобен.

Усяго, такім чынам, у раёне Берліна за 2 мая было ўзята звыш 134 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, з якіх 100 тысяч — войскамі 1-га Беларускага фронту і 34 тысячы — войскамі 1-га Украінскага фронту.

Войскі 4-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, 3 мая авалодалі горадам Цэшын — важным вузлом дарог і моцным апорным пунктам абароны немцаў, а таксама занялі буйныя населеныя пункты Вальтэрсдорф, Бутавіцэ, Фрыдэк, Карвіна, Пагвіздуў, Галешуў, Лешна, Макоў. Савецкае інфармбюро паведамляла, што ў баях за 2 мая войскі фронту ўзялі ў палон больш за 1400 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне на ўсходзе ад горада Брно, з баямі занялі буйныя населеныя пункты Лачноў, Злін, Астраковіцэ, Шэлешовіцэ, Ратае, Кржэновіцэ. «**За 2 мая войскі фронта ўзялі ў палон больш 1 000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Партызанамі Чэхаславакіі ўзят у палон і перадан нашым войскам камандзір 16 нямецкай танкавай дывізіі генерал-маёр Мюлер», — пісала наша газета.**

**Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.**


У імя канчатковага разгрому ворага
Першамайскі загад вялікага правадыра і гістарычныя поспехі Чырвонай Арміі натхняюць беларускі народ на новыя подзвігі
Баявы адказ на заклік правадыра
Адказ калгаснікаў

ВЕКАПОМНАЕ

# ГЕРАІЧНЫ СЛЕД ЗЕМЛЯКОЎ

## Расійскімі пошукавікамі ўстаноўлены імёны 27 беларусаў, якія ў лютым 1942-га загінулі ў Калужскай вобласці

Летась у Ізноскаўскім раёне, што ў межах 100 кіламетраў ад Калугі, падчас пошукавых работ былі выяўлены і падняты для перапахавання астанкі 1250 салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі. Унікальнасць гэтай пошукавай місіі ў тым, што ўсе імёны загінулых устаноўлены. Сярод воінаў, якія мужна змагаліся з ворагам, — 27 ураджэнцаў Беларусі. Члены пошукавага аб'яднання «ВПК «Прарыў», якія займаліся выяўленнем і перапахаваннем астанкаў герояў Вялікай Айчыннай вайны, перадалі ў Беларусь звесткі аб нашых земляках, загінулых у Захараўскай аперацыі ў лютым 1942 года.

## ПРАВОБРАЗ АПЕРАЦЫІ «БАГРАЦІЁН»

Найперш варта расказаць пра бой, які зімой 1942 года адбыўся на тэрыторыі Калужскай вобласці. Ён увайшоў у гісторыю як Захараўская аперацыя, хоць пра яе мала што сказана ў гістарыяграфіі.

Як расказаў «Звяздзе» **член-карэспандэнт Агульнарасійскай грамадскай арганізацыі «Расійская акадэмія прыродазнаўчых навук», член пошукавага аб'яднання «ВПК «Прарыў» Аляксандр ТУМАНАЎ**, з нямецкіх дакументаў вынікае, што студзень і люты 1942-га былі суцэльным крызісам для вермахта: войскі адыходзілі хаатычна, кідаючы цяжкае ўзбраенне: «Такім чынам, армія, якая лічылася непераможнай, страціла свой галоўны козыр — мабільнасць і ператварылася ў звычайную пяхотную. Паміж войскамі ўзніклі праломы, за якія многія камандуючыя былі адпраўлены ў адстаўку».

Камандуючы Заходнім фронтам Георгій Жукаў накіраваў у прарыў 33-ю армію генерала Міхаіла Яфрэмава. За лінію фронту быў высаджаны паветрана-дэсантны корпус, тут апынуўся і гвардзейскі кавалерыйскі корпус Паўла Бялова. «Усе яны мелі адну мэту — выйсці ў раён Вязьмы і перарэзаць шляхі забеспячэння, што стала б катастрофай для ўсёй групы войскаў «Цэнтр», — звяртае ўвагу Аляксандр Туманаў. — Нямецкае камандаванне прыклала неверагодныя намаганні, каб ліквідаваць тыя прарывы. Самалётамі тэрмінова перакідваліся падраздзяленні з Еўропы, сцягваліся войскі з іншых участкаў фронту. Цаной вялікіх страт удалося стварыць глыбокаэшаланіраваную абарону. Але з 5000 дэсантнікаў і эсэсаўцаў, якія прыляцелі сюды з Еўропы, праз два месяцы баёў назад вярнуліся толькі 400».

Самым гарачым пунктам стала вёска Захарава Ізноскаўскага раёна Калужскай вобласці. Менавіта тут быў ажыццёўлены прарыў 33-й арміі. Аднак немцам удалося яго ліквідаваць, а таму ўсе спробы чырвонаармейцаў прыйсці таварышам на дапамогу аказаліся дарэмнымі. «За тры тыдні баёў вёска пераходзіла з рук у рукі дзесяць разоў, — расказвае пошукавік аб'яднання «ВПК «Прарыў». — Бакі панеслі вялікія страты. Вёску Захарава ў выніку ўдалося захапіць».

Па яго словах, гэту аперацыю можна лічыць правобразам будучай аперацыі «Баграціён», калі была ліквідавана большая частка фашысцкай групы войскаў «Цэнтр». «Але для гэтага Чырвонай Арміі трэба было яшчэ вучыцца доўгія два з паловай гады, — удакладняе Аляксандр Туманаў. — На той момант не было магчымасці ажыццяўляць такія стратэгічныя аперацыі». У выніку — вялізныя страты з абодвух бакоў.

## «РАДАСЦЬ АД ТАГО, ШТО ЎСЁ ЗРАБІЛІ ПРАВІЛЬНА»

Днямі — 5 мая — плануецца перапахаванне знойдзеных астанкаў воінаў на воінскім мемарыяле «Іванаўскае поле». У гонар салдат высадзяць алею з 1250 дрэў уздоўж дарогі, якая вядзе да мемарыяла.


Фота з архіва пошукавага аб'яднання «ВПК «Прарыў».

Гэтай важнай падзеі папярэднічала маштабная пошукавая работа. «Усе пахаванні знаходзіліся ў «трохкутніку» былых вёсак Захарава — Крапіўка — Яжова, — расказвае Аляксандр Туманаў. — База даных «АБД-Мемарыял» нам паказала 1250 імёнаў воінаў Чырвонай Арміі, які загінулі ў гэтым месцы. Усе знойдзеныя і прачытаныя медальёны пацвярджаюць спіс з базы даных. Такім чынам, можна з вялікай доляй верагоднасці сцвярджаць, што ўсе імёны байцоў устаноўлены».

Згодна са складзеным спісам, байцамі пошукавага аб'яднання «ВПК «Прарыў» былі вызначаны імёны воінаў Чырвонай Арміі, іх месцы нараджэння і прызыву, дзесьці пазначаны імёны сваякоў. Сярод тых, хто развітаўся з жыццём у гэтым месцы дзеля Перамогі, — прадстаўнікі 54 рэгіёнаў Расіі і 10 рэспублік былога СССР.

Па словах Аляксандра Туманава, з перапахаваннем салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі будзе завершана ўсё, што не паспелі зрабіць нашы папярэднікі. «Сваякі атрымаюць інфармацыю аб сваіх героях, воіны — спакой і вечную памяць, а мы — радасць ад усведамлення таго, што ўсё зрабілі правільна», — лічыць ён.

**Вераніка КАНЮТА.**

## Звярніце ўвагу

Магчыма, вы ўбачыце знаёмае прозвішча і падзеліцеся гісторыяй свайго продка з нашай рэдакцыяй. 5 мая на Калужчыне свой апошні прытулак знойдуць нашы землякі:

*Мікалай Захаравіч БАРАНОК,*
*Андрэй Сямёнавіч БУРТАЕЎ,*
*Гайфула Зарыфульевіч ВАЛЯУЛІН,*
*Іван Яфімавіч ВАСІЛЬСКІ,*
*Раман Мікітавіч ВЕРАМЕЕЎ,*
*Васіль Ерамеевіч ГОЛУБЕЎ,*
*чырвонаармеец ГУБАЙДУЛІН,*
*Рыгор Цімафеевіч ДАВЫДАЎ,*
*Антон Мікалаевіч ДАШКЕВІЧ,*
*Барыс Шлеймавіч ЗАРУБОВІЧ,*
*Шалом Гірмевіч ЗЛОТНІК,*
*Сяргей Іванавіч ІВАНОЎ,*
*Аляксандр Іванавіч КАСЦЮЧЭНКА,*
*Кірыл Фёдаравіч КУРНОСЕНКА,*
*Рыгор Майсеевіч ЛІЦІН,*
*Елісей Андрэевіч МАКАРАЎ,*
*Кірыл Паўлавіч МАСКАЛЁЎ,*
*Іосіф Казіміравіч МАШНОЎСКІ,*
*Мітрафан Цімафеевіч МУРАЎЁЎ,*
*Еўдакім Данілавіч СЕРГІЕНКА,*
*Ізраіль Давыдавіч СІЛУЙЛЕВІЧ,*
*Павел Сяргеевіч СІМАНЕНКА,*
*Захар Авакумавіч СІНКЕВІЧ,*
*Леанід Арсенцьевіч САЛАЎЁЎ,*
*Фёдар Ануфрыевіч ЦЕЛЯПНЁЎ,*
*Аляксей Сямёнавіч ФАМІН,*
*Майсей Сямёнавіч ФРЫДЗОН.*

Дата і месца нараджэння нашых землякоў, рэгіён прызыву ў Чырвоную Армію, месца службы і нумар падраздзялення, дата іх гібелі ўказана побач з матэрыялам на нашым сайце (https://zviazda.by). Акрамя таго, пра гэтыя звесткі можна даведацца, патэлефанаваўшы па нумары 8 (017) 311 17 19.

**ООО «СпецРеализация»**
**объявляет о проведении вторых повторных публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица –**
**ЧП «МБС-ТоргСервис»**
*(УНП 191778882, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, ул. Лопатина, д. 7А, пом. 804).*

***Дата и время проведения торгов:* 14 мая 2025 года.**
Начало – 12.00. Заявки принимаются с 03 мая 2025 года по 12 мая 2025 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ЧП «МБС-ТоргСервис» (УНП 191778882), в лице председателя ликвидационной комиссии Миневич С. Г.**
Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %.
Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интеренет-сайте https://specrealization.by.
Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.
*Сведения о предыдущих торгах:*
*РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 42 (30430) за 01.03.2025. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 68 (30456) от 08.04.2025.*

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ГВТУП «БЕЛСПЕЦВНЕШТЕХНИКА»** (Продавец) на праве хозяйственного ведения.

**Электронные торги состоятся 03.06.2025.**

**Лот № 1:** VOLKSWAGEN CADDY, кузов (рама) № WV2ZZZ2KZKX022035, 2018 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 84 360,00 руб.
Место нахождения: г. Минск, ул. Калиновского, 8.
Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).
**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **РУП «Белгипроводхоз»** на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Аукцион состоится 03.06.2025 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1.** Автомобиль SAMAND LX, кузов (рама) № Y3W2PSMLX9FNX0647 NAAC91CC69F166561, 2009 г. в.
**Начальная цена с НДС 20 % –** 1 878,77 руб.
**Место нахождения Лота № 1:** г. Минск, пр-т. Машерова, д. 25.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.
**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

**ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ**
по объекту «Строительство группы многоэтажных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения № 7, № 8 по г/п по ул. Р. Люксембург и многоуровневой автостоянки». Жилой дом № 8 по генплану»,
*опубликованной в газете «Звязда» от 05.04.2025 № 67 (30455)*

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагаются 5 торговых помещений, расположенных на 1 этаже, в том числе:
- торговое помещение № 1 общей площадью 48,96 кв. м;
- торговое помещение № 2 общей площадью 42,63 кв. м;
- торговое помещение № 3 общей площадью 48,96 кв. м;
- торговое помещение № 4 общей площадью 42,63 кв. м;
- торговое помещение № 5 общей площадью 48,96 кв. м.

Стоимость строительства 1 квадратного метра торгового помещения составляет 6 500,00 белорусских рублей.
**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 30 % от стоимости договора в течение 10 (десяти) календарных дней с даты регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе, остаток – по графику платежей.
**Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:**
для физических лиц – паспорта (биометрического документа, удостоверяющего личность); доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;
для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорта представителя (биометрического документа, удостоверяющего личность), копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.
Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.
Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации.
Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 08.05.2025 года по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).
Подробные сведения об объекте долевого строительства, о планировках квартир и ходе строительства можно получить в офисе продаж по адресу: **220025, г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213, тел.: (017) 234-16-98, (044) 795-44-44.**
УНП 192400611

# ФІЛАСОФІЯ ПОСПЕХУ

## Пры падтрымцы Банка развіцця ў Гомельскай вобласці пабудаваны чарговыя эфектыўныя птушнікі

У лістападзе мінулага года на базе гэтага найбуйнейшага на Гомельшчыне валаўтваральнага вытворцы мяса птушкі — «Беларуснафта-Асобіна» — урачыста адкрылі пабудаваныя пры падтрымцы Банка развіцця ферму адкорму курaнят-бройлераў «Цеклеўка» і шэсць птушнікаў, а ўжо сёлета на базе вытворчага цэха «Сож» увялі яшчэ чатыры, паведамілі ў прэс-службе банка.



— Гэтыя праекты — яркі прыклад філасофіі Банка развіцця: інвестыцыі павінны працаваць на будучыню. Новыя аб'екты з'яўляюцца сучаснымі высокатэхналагічнымі комплексамі, якія дазволяць на працягу многіх гадоў не толькі забяспечваць якасна́й прадукцыяй беларусаў, але і дзякуючы экспарту павышаць нацыянальны прэстыж за мяжой. Упэўнены, вынікі рэалізацыі такіх важных інвестпраектаў не фінальны пункт супрацоўніцтва банка і прадпрыемства, а магутны старт для новых амбіцыйных задач, — перакананы **начальнік Гомельскага філіяла Банка развіцця Андрэй КЛІМАЎ.**

Калі ў Цеклеўцы птушнікі прызначаны для вытворчасці мяса курaнят-бройлераў, то задача новых чатырох комплексаў у вытворчым цэху «Сож» — атрыманне якаснага пагалоўя бацькоўскага статка курэй і, як вынік, павышэнне ўзнаўлення птушкі. Гэты інвестпраект рэалізаваны ў рамках дзяржпраграмы «Аграрны бізнес» і мае вялікае значэнне для развіцця прадпрыемства.

— Новыя птушнікі прадугледжваюць падлогавае ўтрыманне курэй на 8250 галоў кожны. Гэтыя комплексы арганічна ўпісваюцца ў эканоміку прадпрыемства: калі раней мы закуплялі інкубацыйныя яйкі, то з уводам гэтых аб'ектаў атрымаем у год 4,8 мільёна штук. Гэта дасць магчымасць не толькі забяспечваць уласную вытворчасць, але і прадаваць іх на экспарт з добрай рэнтабельнасцю. Акрамя гэтага, мы зможам атрымліваць дадатковую выручку за кошт рэалізацыі каля 240 тысяч сталовых яек у год, — адзначыў **начальнік вытворчага цэха Анатоль ДАМЕНІКАЎ.**

Акрамя аб'ектаў, дзе ўтрымліваецца птушка, у рамках рэалізацыі інвестыцыйнага праекта пабудавана ўся неабходная для іх інфраструктура: ачышчальныя збудаванні, артэзіянскія свідравіны, а таксама закуплена сучаснае тэхналагічнае абсталяванне. У выніку ў новых птушніках усё прадумана да дробязяў. Тут выкананы ўсе неабходныя правілы біябяспекі, устаноўлены сістэмы газацыі і дэзынфекцыі, аўтаматычна падтрымліваецца мікраклімат.

Як асабліва адзначылі ў Банку развіцця, наша краіна актыўна развівае птушкагадоўлю як ключавы кірунак аграпрамысловага комплексу, забяспечваючы харчовую бяспеку і нарошчваючы экспартны патэнцыял.

2. подать организатору торгов в срок с даты опубликования **до 15.00 12 мая 2025 года** заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (ред. от 12.07.2013), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов (соглашение о выплате аукционного сбора). Формы документов необходимо предварительно запросить у Организатора аукциона. Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406; время с 9.00 до 16.00 в рабочие дни. Направление документов почтовым отправлением, с целью регистрации в качестве участника аукциона не допускается. Телефон для ознакомления и осмотра лота: +375296847176 Яскевич Дмитрий Васильевич в рабочие дни с 9.00 до 16.00;

3. в день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три рабочих дня до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником, или для участия в торгах явился только один участник;

- для участия в торгах не было подано ни одного заявления, или ни один из участников не явился.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов, единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также выплатить вознаграждение организатору торгов (аукционный сбор) в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов, единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в день проведения торгов обязан подписать протокол о результатах торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов, единственным участником несостоявшихся торгов, выразившим согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 15 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен ликвидационной комиссией (ликвидатором).

*Сведения о предыдущих торгах:*
*РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 52 (30440) от 15.03.2025 г.*

*Рынак працы*

# ПАДЗАРАБІЦЬ І ВЫЗНАЧЫЦЦА З ВЫБАРАМ

## Больш за дзве тысячы працоўных месцаў прапанавалі работадаўцы Гомеля падчас Рэспубліканскага маладзёжнага кірмашу вакансій

На працягу трох дзён установы адукацыі, прадпрыемствы, арганізацыі і кампаніі, гатовыя працаўладкаваць школьнікаў і студэнтаў, працавалі на прэзентацыйных пляцоўках у гомельскім Лядовым палацы, гарадскім упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі. На базе ВНУ маладзёжны кірмаш вакансій правялі ў фармаце прафарыентацыйнага мерапрыемства, да якога далучыліся 22 установы адукацыі Гомеля ўсіх ступеняў.

Акрамя таго, у маладзёжным кірмашы вакансій узялі ўдзел каля 60 арганізацый, прадпрыемстваў і кампаній Гомеля. Яны прапанавалі варыянты часовай летняй занятасці для навучэнцаў і працаўладкаванне па спецыяльнасцях для студэнтаў.

— Усяго было прапанавана больш за дзве тысячы вакансій розных кірункаў: ад работы, якая не патрабуе спецыяльнай адукацыі, да працаўладкавання па рабочай кваліфікацыі, — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама Галіна САМСОНА.** — Для юнакоў і дзяўчат, якім ужо споўнілася 16 гадоў, шэраг гандлёвых прадпрыемстваў гатовы былі прапанаваць работу ў сферы грамадскага харчавання, на гандлёвых пляцоўках. У Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» таксама ёсць прапановы на летні перыяд для моладзі.

Супрацоўнікі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама непасрэдна на кірмашы правялі для навучэнцаў анлайн-тэсціраванне «Крок у прафесію» на партале дзяржаўнай службы занятасці.

— Маладыя людзі могуць вызначыцца з прафесійным кірункам, а пасля адразу ж на кірмашы звярнуцца да прадстаўнікоў установы адукацыі, якая рыхтуе спецыялістаў падобнага профілю, і атрымаць больш падрабязную інфармацыю аб прафесіі, факультэтах, правілах прыёму, — звярнула ўвагу Галіна Самсона.

Дзевяцікласнік гімназіі № 58 г. Гомеля імя Ф. П. Гааза Кірыл разам з мамай Вольгай вельмі задаволеныя, што прыйшлі на маладзёжны кірмаш.

— Хачу паглядзець і прапановы спецыяльнасцяў для будучага паступлення, і магчымасці працаўладкавання на лета, — кажа школьнік. — Яшчэ няма ніякага працоўнага вопыту, але ёсць вялікае жаданне. Хацеў бы папрацаваць афіцыянтам у кафэ ці па якойнебудзь вакансіі ў сферы абслугоўвання.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**



*Пакаленне XXI*

# ЗНАЙСЦІ АСАБІСТУЮ ПЕРСПЕКТЫВУ

Выбар будучай прафесіі — адзін з найбольш важных і адказных этапаў для кожнага чалавека. Гэта не проста крок у дарослае жыццё, але і магчымасць знайсці сябе, рэалізаваць свае мары і таленты. Як сучасныя школьнікі падыходзяць да пошуку свайго курсу, мы распыталі вучняў выпускных класаў гімназіі № 11 г. Мінска імя І. Д. Чарняхоўскага. Хлопцы падзяліліся сваімі думкамі пра вучобу, выбар прафесіі, уплыў на іх рашэнне розных фактараў.

**Дамір Міцкевіч:**

**«Галоўнае — зразумець, што падыходзіць табе»**

Дамір ужо вызначыўся з будучай прафесіяй. Ён плануе паступаць на спецыяльнасць «Графічны дызайн і мультымедыядызайн». Для яго такі выбар — не проста спроба знайсці стабільную работу, але і магчымасць рэалізаваць свае творчыя здольнасці.

«Самае складанае падчас выбару прафесіі — зразумець, што сапраўды падыходзіць менавіта табе. Я лічу: паспяховасць па пэўных прадметах істотна ўплывае на выбар, гэта важна для паступлення ў ВНУ. А вышэйшая адукацыя для ўдалай кар'еры сёння абавязковая».

Найбольш цікавыя для Даміра прадметы — англійская мова і грамадазнаўства.

«На выбар прафесіі ўплываюць інтарэсы, мае магчымасці і меркаваны заробак. Вызначыцца канчаткова ў большай ступені дапамагаюць у тым ліку і парады бацькоў. Я, у адрозненне ад іншых, прыслухоўваюся да старэйшага пакалення. А вось меркаванне аднакласнікаў для мяне не мае значэння».

**Міхаіл Ігнатовіч:**

**«Цікавасць на ўсё жыццё — вось што важна»**

У Міхаіла сярэдні бал вышэй васьмі. Сярод любімых прадметаў — матэматыка і грамадазнаўства, яны звязаны з будучымі прафесійнымі планамі юнака.

«Я разумею, што правільны выбар прафесіі вызначыць маю будучыню. Самае складанае — знайсці такую сферу дзейнасці, якая была б цікавай мне ўсё жыццё. Выбіраючы, вядома, арыентуюся на асабістыя інтарэсы, прэстыж будучай спецыяльнасці і стабільны заробак», — кажа Міхаіл.

Ён пакуль не вызначыўся канчаткова, але разглядае прафесіі пілота грамадзянскай авіяцыі або юрыста.

«Да парад бацькоў і настаўнікаў стаўлюся нейтральна, імкнуся адэкватна ацэньваць іх меркаванне. Не ўплывае на мой выбар і меркаванне аднакласнікаў. Мне тут, хутчэй, дапамаглі розныя артыкулы, відэа, дні адкрытых дзвярэй у ВНУ», — расказвае Міхаіл.

**Глеб Церашкоў:**

**«Галоўнае, каб работа прыносіла задавальненне»**

Глеб да выбару прафесіі падыходзіць больш свабодна. Яму не вельмі падабаецца вучыцца ў школе, сваімі адзнакамі ён задаволены. Найбольш цікавы прадмет — інфарматыка, бо яна непасрэдна звязана з камп'ютарнай тэматыкай, якая хлопцу па душы.

«Магчыма, паспяховасць па пэўных прадметах і ўплывае на выбар прафесіі. Часцей вучні імкнуцца атрымліваць добрыя адзнакі па ўсіх прадметах, каб паступіць на прэстыжную спецыяльнасць, нават калі нейкія дысцыпліны ім не падабаюцца», — разважае Глеб.

Сам ён плануе займацца камп'ютарнай інжынерыяй. Але прызнаецца, што не ўпэўнены, ці застанецца ў гэтай сферы: «Я мог бы стаць таксама мастаком або кімсьці яшчэ».

**Андрэй МАТУСЕВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

| № лота | Наименование объекта/ характеристика объекта | Местонахождение объекта/ кадастровый номер участка | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1/5 доля в праве на объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-66005, общей площадью здания 203,0 кв. м, общей площадью жилого помещения 170,3 кв. м, жилой площадью 85,8 кв. м (назначение: Здание одноквартирного жилого дома, наименование: Жилой дом), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001003137, площадью 0,15 га. Составные части и принадлежности: Мансарда, Подвал, Летняя кухня, Сарай, Погреб под сараем, Уборная н/ч, Уборная п/ч, Ворота, Забор, Погреб н/ч, Сарай. Адрес объекта: **Брестская обл., г. Брест, ул. Речицкая, 12**. Год постройки – 2011 | 140100000001003137 Брестская обл., г. Брест, ул. Речицкая, 12 | **45 090,00** | 4 509,00 |

**Объект продается по поручению управления Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь по Брестской области**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» Контактный телефон 53-81-92.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.gki.gov.by, www.dha.gov.by, www.brest-region.gov.by**

**При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.**
**Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом**

**Ответственное лицо, принявшее имущество на хранение – Качановская Лидия Степановна, тел. 8 (0162) 25-22-48**

**Сумма задатка в размере 10 % от начальной цены продажи перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00 30.05.2025 г.**

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63 «О совершенствовании работы с имуществом, изъятым, арестованным или обращенным в доход государства» (вместе с «Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства»). Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты Республики Беларусь, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – участники аукциона). К участию в торгах допускаются лица, представившие организатору торгов копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет **р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924,** получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

К заявлению на участие в аукционе прилагаются: **юридическим лицом** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица, без нотариального засвидетельствования; **представителем юридического лица** – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

- **в течение 3 рабочих дней** со дня проведения аукциона оплатить сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.
- **не позднее 20 рабочих дней** со дня подписания протокола о результатах аукциона оплатить стоимость приобретенного на аукционе объекта недвижимого имущества. Победитель аукциона приобретает право собственности на недвижимое имущество в соответствии с законодательством.

Земельный участок, на котором размещается недвижимое имущество, предоставляется победителю аукциона без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды земельного участка при его предоставлении в аренду.

**По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным**

**Аукцион состоится 03 июня 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607. Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 03.05.2025 г. до 16.00 30.05.2025 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50**

НАВУКА І ЖЫЦЦЁ

# ПАДАРУНАК ДЛЯ АЛЕРГІКАЎ

## Унікальная тэст-сістэма, якая дазваляе за адзін аналіз выяўляць да 200 алергенаў, адзначана ў праекце «100 ідэй для Беларусі»

Для малодшага навуковага супрацоўніка Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі Анастасіі ДАВЫДЗЕНКІ ўдзел у рабоце над ёй стаў першым сур'ёзным і вельмі натхняльным досведам.

— Мікрачып для выяўлення алергенаў — гэта тонкая пракладка памерам 7,5 на 2,5 см, — распавядае аб вынаходніцтве Анастасія Давыдзенка. — На пракладцы ў выглядзе кружочкаў змяшчаецца 200 алергенаў. Для аналізу на мікрачып дастаткова капнуць кроплю сывараткі крыві пацыента. Калі ў ёй ёсць спецыфічныя антыцелы, то яны звяжуцца з адпаведнымі алергенамі. А далей наносім флуарэсцэнтны «праявіцель» і атрымліваем малюнак з дапамогай лазернага сканера. Калі нейкі «кружочак» «свеціцца» — значыць, у крыві ёсць антыцелы да дадзенага алергена і, адпаведна, менавіта ён — прычына пакут пацыента.

Ідэя праекта па распрацоўцы такой тэст-сістэмы належыць дырэктару інстытута Андрэю Ганчарову. Рэалізоўвалі праект з 2022 года супрацоўнікі лабараторыі медыцынскай біяфізікі, якую ўзначальвае Кацярына Шамава. Падбор найбольш актуальных для беларусаў алергенаў ажыццяўляўся пад кіраўніцтвам урача-алерголага Антаніны Осіпавай. Пракладкі, на якіх вырабляецца мікрачып, зроблены ў БДУІР.

Анастасію Давыдзенку запрасілі да супрацоўніцтва крыху пазней, калі для правядзення даследаванняў спатрэбіўся хімік.

— На той момант я вучылася ў магістратуры хімфака БДУ, — успамінае малады навуковец. — Адразу адгукнулася на прапанову — яна падалася вельмі прывабнай. З боку калег сустрэла выключна добразычлівае стаўленне: усе дапамагалі, падтрымлівалі, падказвалі. Не ўсё атрымлівалася ў нас адразу, але тым даражэйшым аказаўся вынік інтэнсіўнай двухгадовай працы.

Пакуль падобныя імпартныя тэст-сістэмы прапаноўваюцца ў Беларусі толькі ў камерцыйных лабараторыях, яны вельмі дарагія. А скурныя пробы — значна больш працаёмкі метад дыягностыкі. Айчынныя вучоныя імкнуцца зрабіць інавацыйныя спосабы выяўлення алергенаў даступнымі для ўсіх беларусаў.



Перш чым трапіць ва ўстановы аховы здароўя, створаны ў Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі мікрачып павінен прайсці яшчэ клінічныя выпрабаванні, яго трэба зарэгістраваць як выраб медыцынскага прызначэння. Але прызнанне сваёй працы навукоўцы ўжо адчуваюць.

— Мы прадставілі нашу тэст-сістэму ў рамках «Фестывалю навукі» ў верасні мінулага года ў Батанічным садзе, — расказвае Анастасія Давыдзенка. — Многія наведвальнікі з цікаваcцю распытвалі, калі і дзе можна зрабіць тэст. Памятаю, падыходзіць да нашага стэнда хлопчык: тлумачу яму, што гэта за вынаходніцтва, для чаго яно. Выслухаўшы, ён бяжыць да жанчыны непадалёк ад нас і гучна крычыць: «Мама-мама, нам туды трэба!» Каштоўнасць нашай распрацоўкі зразумела нават дзіця!

Спосабам выяўлення алергенаў Анастасія Давыдзенка збіраецца прысвяціць і сваю кандыдацкую дысертацыю, над якой цяпер працуе.

— Мяне заўсёды прыцягвала навука, — прызнаецца суразмоўніца. — У буднях вучонага няма руціны, няма месца нудзе. Кожны праект — гэта новая задача, новыя даследаванні, няхай маленькія, але сапраўдныя адкрыцці. Назапашванне ведаў, азарт, які ты пры гэтым адчуваеш, — самае прывабнае ў маёй прафесіі. Гэта вельмі натхняе!

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ, фота аўтара.**

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### Государственное предприятие «МГЦН» 27 **мая** 2025 **года** проводит 395**-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Арендодатель имущества | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента спроса к базовой ставке арендной платы (от 0,3 до 3) или размер арендной платы в БАВ | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Наименование и целевое использование имущества |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 50 | УП «Жильё», тел. 8 (0177) 768532 | **Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 37** | 12,80 | 3 | 60,06 | Помещение под: 1) организацию торговли непродовольственной и продовольственной группами товаров; 2) предоставление услуг (кроме похоронных бюро, магазинов ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, а также физкультурно-оздоровительной деятельности); 3) офис; склад**. Срок аренды – 3 года** |
| 51 | | **Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул.Труда, 14** | 71,93 | 1 | 337,53 | Помещение под: 1) организацию торговли непродовольственной и продовольственной группами товаров; 2) предоставление услуг (кроме похоронных бюро, магазинов ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, а также физкультурно-оздоровительной деятельности); 3) офис; склад. **Срок аренды – 3 года** |
| 52 | | **Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, аг. Лошница, ул. Кирова, 13Б** | 70,05 | 3 | 328,71 | Помещения под: 1) организацию торговли непродовольственной и продовольственной группами товаров; 2) предоставление услуг (кроме похоронных бюро, магазинов ритуальных услуг и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр, а также физкультурно-оздоровительной деятельности); 3) офис; 4) склад **Срок аренды – 3 года** |
| 53 | Районное коммунальное унитарное предприятие «Смолевичское ЖКХ», тел. 801776 27638 | **г. Смолевичи, ул. Советская, возле остановочного пункта у центра банковских услуг № 508 в г. Смолевичи Региональной дирекции по г. Минску и Минской области открытого акционерного общества «Белагропромбанк» (согласно схеме)** | 28,00 | 0,3 базовой арендной величины за 1 м² | 131,39 | Открытая площадка с покрытием под павильон (для реализации бумажно-беловой продукции и канцелярских товаров) |
| 54 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода, в районе перекрестка улиц Машерова и Центральная (согласно схеме)** | 10,00 | 0,3 базовой арендной величины за 1 м² | 46,93 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный объект общественного питания |
| 55 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода, в районе перекрестка улиц Машерова и Центральная (согласно схеме)** | 15,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 70,39 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (продукция растениеводства) |
| 56 | | **Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода, возле Центральной площади (согласно схеме)** | 10,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 46,93 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (лоток, мясные продукты) |
| 57 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода, возле Центральной площади (согласно схеме)** | 24,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 112,62 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (лоток, овощи, фрукты) |
| 58 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода; возле Центральной площади (согласно схеме)** | 16,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 75,08 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (лоток, овощи, фрукты) |
| 59 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода (согласно схеме)** | 18,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 84,47 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (павильон, овощи, фрукты) |
| 60 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода, улица Центральная (согласно схеме)** | 36,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 168,93 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (павильон, непродовольственные товары) |
| 61 | | **Смолевичский район, Озерицко-Слободской сельсовет, аг. Слобода, улица Центральная (согласно схеме)** | 50,00 | 0,2 базовой арендной величины за 1 м² | 234,63 | Открытая площадка с покрытием под нестационарный торговый объект для осуществления розничной торговли (павильон, непродовольственные товары) |
| 62 | РУП «Белинвестэнерго-сбережение», тел.: (017) 360 46 83 | **г. Минск, ул. Долгобродская, 12-2Н** | 16,80 | 1 | 78,83 | Встроенное помещение под административные цели (офис) |
| 63 | | **г. Минск, ул. Долгобродская, 12-2Н** | 13,50 | 1 | 63,35 | Встроенное помещение под административные цели (офис) |
| 64 | | **г. Минск, ул. Долгобродская, 12-2Н** | 12,60 | 1 | 59,13 | Встроенное помещение под административные цели (офис) |
| 65 | | **г. Минск, ул. Долгобродская, 12-2Н** | 17,50 | 1 | 82,12 | Встроенное помещение под административные цели (офис) |
| 66 | | **г. Минск, ул. Долгобродская, 12-2Н** | 92,60 | 1 | 434,53 | Встроенное помещение под административные цели (офис) |
| 67 | Белорусский государственный университет, тел. 8017 2095522 | **г. Минск, ул. Ленинградская, 8** | 20,70 | 3 | 97,13 | Помещение под размещение центра по оказанию печатных услуг. **Срок аренды – 3 года** |

Договор аренды заключается сроком **на пять лет**, если иное не указано в настоящей информации.
Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22. Аукцион состоится **27 мая 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02 мая 2025 г. по 21 мая 2025 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Расчетный счет для перечисления задатка: BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 395 от 27.05.2025 по предмету аукциона № ___**.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона **www.mgcn.by** (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»), Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by** (раздел «Аукционы по продаже недвижимости»).
Телефон для справок **+375 (17) 360 42 22.**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Тыдзень можа складвацца спрыяльна для любой інтэлектуальнай дзейнасці. Асабліва паспяхова пойдзе працэс навучання. Гэта выдатны час для новых знаёмстваў. Вы можаце адчуць, што знаходзіцеся на парозе новага, больш аптымістычнага вітка свайго жыцця.



**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні рэкамендуецца весці ціхі і адасоблены лад жыцця. Вы зможаце палепшыць сваё фінансавае становішча. Гэта добры час для вырашэння матэрыяльных праблем, здзяйснення пакупак. Ёсць магчымасць умацаваць сваё здароўе. Таксама вам усміхнецца ўдача ў кар'еры. Калі вы хацелі знайсці добрую работу, то гэта магчыма.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні вы будзеце ў пошуку новых уражанняў. Магчыма, з'явіцца больш часу для зносін з сябрамі. Знешнія абставіны складваюцца спрыяльна і для тых, хто прывык дзейнічаць самастойна і ініцыятыўна. Існуе верагоднасць здзяйснення вашага запаветнага жадання.



**РАК.** Магчымае павышэнне сацыяльнага або прафесійнага статусу. Таму не трэба баяцца змен. Змены на рабоце могуць адкрыць для вас новыя магчымасці прафесійнага росту. Змены ў асабістым жыцці пакладуць пачатак новым знаёмствам, рамантычным адносінам.



**ЛЕЎ.** На гэтым тыдні рэкамендуецца больш часу аддаваць пашырэнню кругагляду, атрыманню карысных навыкаў і ведаў. Перыяд пройдзе на аптымістычнай хвалі. Вам, магчыма, будзе неверагодна шанцаваць у справах, вы адчуеце нябачную падтрымку лёсу, і шчаслівы выпадак дазволіць вам выходзіць сухімі з вады з самых складаных сітуацый. Акрамя таго, абавязкова прыслухоўвайцеся да сваёй інтуіцыі. Добры час для ўмацавання шлюбнага саюза.



**ДЗЕВА.** У вас узмоцніцца энергетычны патэнцыял. Вы зможаце дамагчыся выдатных вынікаў у спорце, устанавіўшы асабістыя рэкорды. Палепшыцца ваша фінансавае становішча. Вы з задавальненнем будзеце брацца за любую работу, накіраваную на прывядзенне ў парадак навакольнай прасторы. Не трымайцеся за непатрэбны хлам, вызваляйце сваю жыццёвую прастору — так вы зможаце ўпусціць у жыццё новую энергію.



**ШАЛІ.** На гэтым тыдні выдатны час для развіцця шлюбных адносін. З партнёрам па шлюбе можа ўстанавіцца поўнае паразуменне. Таксама вы можаце адчуць узмацненне цягі да ведаў і атрымаць поспех у вучобе. Паспяхова будуць праходзіць турыстычныя паездкі, службовыя камандзіроўкі — вы даведаецеся за гэтыя дні шмат новага і цікавага. У выніку ваш аўтарытэт павысіцца.



**СКАРПІЁН.** Час спрыяльны для навядзення парадку ў хатніх справах і на рабоце. Гэта добры перыяд для пазбаўлення ад шкодных звычак. Падсвядома вы будзеце імкнуцца да ўсяго, што мае дачыненне да вострых уражанняў, выкіду адрэналіну ў кроў. Узрасцуць вашы фінансавыя магчымасці, вы зможаце зрабіць буйную пакупку.



**СТРАЛЕЦ.** Тыдзень можа стаць шчаслівым часам для закаханых. Шлюбныя адносіны будуць напоўнены аптымізмам і каханнем. На працягу ўсяго перыяду трэба будзе шмат кантактаваць з людзьмі са свайго кола. Таксама гэта добры час для творчасці, спартыўных спаборніцтваў, хобі і прыемнага бесклапотнага баўлення часу.



**КАЗЯРОГ.** Сям'я ў гэты час можа стаць найбольш прыярытэтнай сферай, дзе вы зможаце сябе найлепшым чынам рэалізаваць. З'явіцца шмат прыемных клопатаў, звязаных з добраўпарадкаваннем жылля. Члены сям'і падтрымаюць вас у пачыннаннях. Таксама рэкамендуецца звярнуць максімум увагі ўдзяляць свайму рэжыму дня. Магчымы рост даходаў. Гэта дазволіць вам зрабіць удалыя пакупкі для сябе і для дому.



**ВАДАЛІЎ.** Шырокія сацыяльныя сувязі на гэтым тыдні паспрыяюць вырашэнню шырокага кола актуальных пытанняў. Вельмі прыемны перыяд для закаханых. Адзінокія могуць чакаць рамантычныя знаёмствы. Тыдзень будзе звязаны з творчым узлётам і новымі асабістымі дасягненнямі. Гэта выдатны час для хуткага прасоўвання ў вучобе.



**РЫБЫ.** Многія пазітыўныя моманты на гэтым тыдні стануць магчымыя дзякуючы ўмацаванню фінансавага становішча за кошт асноўнай работы і за кошт дадатковай падпрацоўкі. Так вы зможаце павысіць дабрабыт сваёй сям'і. Гэта добры час для ўнутрысямейнага дыялогу.

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## КАЛІ ЗАНЯЎ СВОЙ ПЕРШЫ ПОСТ, НЕ ЗАДЗІРАЙ ВЫСОКА НОС...

**Прыродны газ многія называюць блакітным палівам. Нехта кажа, што гэта праз досыць яркі колер пры яго згаранні, нехта — праз тое, што ён па-ранейшаму застаецца блакітнай марай, бо, здаецца, спраўдзіш і гора болей не ведаеш: ні табе дровы нарыхтоўваць, ні да печы іх насіць, ні потым попел выграбаць... Чысціня, цеплыня, камфорт.**



Але ж гэта — калі ў парадку ўсё абсталяванне. Газавікі досыць пільна сочаць за ім, каб не здарылася якая бяда, праводзяць прафілактыку (асабліва ў дамах з калонкамі ды ацяпляльнымі катламі). Пліту тады правяраюць асобна, калонку — асобна, але ж самая складаная прылада — гэта кацёл. Яму найбольшая ўвага.

Так яны гаспадыням кажуць (найчасцей — старэнькім), калі за свае візіты грошы бяруць.

...Нейкай восенню да бабулі адной завіталі, божага дзьмухаўца: паказалі дакументы — пусціла ў дом. Там, падсеўшы да стала, старэйшы з іх узяўся разбірацца з паперамі, маладзейшы падышоў да катла, трохі «пашаманіў»: царанўў па корпусе, падзьмуў з аднаго боку, з другога і думаў, што на гэтым прафілактыка скончана.

— Гаспадыня, — сказаў, — прымайце работу, падпісвайце акт.

— Можа, ранавата? — спытала ў яго жанчына. — Ты ж яшчэ фільтр не пачысціў.

— А вы што — хочаце без цяпла застацца? — са з'едлівай усмешачкай спытаў газавік. — Дык гэта будзе, калі контргайку раптам сарваць.

— Ды гледзячы як тое зрабіць. Бяры два ключы, — загадала хлопцу гаспадыня. — Тым, што ў левай руцэ, фіксуй асноўную гайку, ключом у правай акуратненька адкручвай контргайку, потым лёгенька адкручваецца асноўная... Здымай фільтр... Чысці... Акуратна пастаў на месца. Цяпер спачатку закруці асноўную гайку, зафіксуй, потым закруці контргайку...

Расчырванеўся хлопец, але ж робіць усё як трэба, бо над душой яшчэ і напарнік стаіць: выйшаў з-за стала, кантралюе...

Хоць, калі па шчырасці, хапіла б кантролю і з боку гаспадыні, бо яна, Таццяна Юр'еўна (інжынер па адукацыі і педагог па прызванні), больш за 40 гадоў адпрацавала ў тэхнічным вучылішчы. І была не проста выкладчыцай, а выкладчыцай-метадыстам вышэйшай катэгорыі. Тэхніка ўвесь гэты час мянялася, рабілася ўсё больш дасканалай, і з кожнай навінкай Таццяна Юр'еўна грунтоўна разбіралася — спачатку сама, а потым вучыла і навучэнцаў, і майстроў вытворчага навучання. Тыя гайкі-контргайкі адкручваць-закручваць ды так, каб не сарваць разьбу, хлопцам мо тысячы разоў паказвала. Вока набіла настолькі, што ці не з першай «аперацыі» бачыла, каму з навучэнцаў можна любую тэхніку даверыць, а каму — лепей шуфель ды тачку.

Не дзіва, што калі ў дом правялі газавае ацяпленне, яна сама і назубок, што называецца (памяць мала таго што прыродная, дык яшчэ трэніраваная), вывучыла інструкцыю па эксплуатацыі абсталявання. У веданні магла б даць фору любому газавіку, але ж пакуль абмежавалася пстрычкай — па так важна задраным носе.

**Л. ЧЫГРЫНАВА,**
**г. Мінск.**

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| **МІНСК** 750 мм рт.сл. | +7..+9°C | +13..+15°C |
| **ВІЦЕБСК** 750 мм рт.сл. | +7..+9°C | +12..+14°C |
| **МАГІЛЁЎ** 750 мм рт.сл. | +8..+10°C | +14..+15°C |
| **ГОМЕЛЬ** 750 мм рт.сл. | +10..+13°C | +17..+18°C |
| **ГРОДНА** 751 мм рт.сл. | +9..+10°C | +14..+16°C |
| **БРЭСТ** 753 мм рт.сл. | +12..+13°C | +15..+16°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Маладзік 27.04—03.05. Месяц у сузор'і Льва*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| **МАСКВА** | +18..+20°C |
| **С.-ПЕЦЯРБУРГ** | +8..+10°C |



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 3 МАЯ — Даты, Падзеі, Людзі




**1892** год — нарадзіўся Станіслаў Мертэнс, беларускі дзяржаўны і партыйны дзеяч. Дэлегат I з'езда КП(б)Б. З вясны 1920 года — намеснік старшыні Смаленскага губвыканкама, пазней — наркам унутраных спраў БССР. З канца 1921-га — на нелегальнай рабоце ў Польшчы. Член Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Адзін з арганізатараў КПЗБ. З кастрычніка 1925 года да студзеня 1928-га знаходзіўся ў польскай турме. У выніку абмену палітвязнямі пераехаў у СССР, працаваў у Камінтэрне.

**1939** год — нарадзіўся Леанід Аляксеевіч Нячаеў, беларускі і расійскі кінарэжысёр, народны артыст Расіі. У 1973 —1990 гадах працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Рэжысёр мастацкіх фільмаў і тэлефільмаў «Прыгоды Бураціна», «Прыгоды ў горадзе, якога няма», «Прадрадзены смех», «Рыжы, сумленны, закаханы» і іншых.

**1977** год — пачаты работы па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна на пляцоўцы каля парка Чалюскінцаў.




**1314** год — нарадзіўся Сергій Радонежскі, ігумен Рускай царквы, заснавальнік шэрагу манастыроў, у тым ліку Свята-Троіцкага манастыра пад Масквой (цяпер Троіца-Сергіева лаўра). Лічыцца духоўным збіральнікам рускага народа.

**1494** год — Хрыстафор Калумб адкрыў Ямайку, адзін з Вялікіх Антыльскіх астравоў.

**1810** год — англійскі паэт Джордж Гордан Байран з афіцэрам, які суправаджаў яго, пераплыў праліў Дарданэлы з еўрапейскага берага на азіяцкі, залежыўшы тым самым традыцыі запльваў праз пралівы.

**1870** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Бенуа, рускі мастак, гісторык мастацтва, мастацкі крытык. Адзін з арганізатараў і ідэолаг часопіса «Мир искусства» і аднайменнага мастацкага аб'яднання. Належыць да ліку рэфарматараў рускага тэатральна-дэкаратыўнага жывапісу на мяжы XX ст.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 927. Індэкс 63850. Зак. № 1041.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 мая 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12